Пралетарыі ўсіх краёў, злучэ...
ערשט, פאַרייניקט זיך!
...lich krajów, łączcie się!
...сех стран, соединяйтесь!

# САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

XII год выданьня
Штодзённая газэта

ОРГАН ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТУ САВЕТАЎ РАБОЧЫХ, СЯЛЯНСКІХ І ЧЫРВОНААРМЕЙСКІХ ДЭПУТАТАЎ І САВЕТУ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БЕЛАРУСКАЙ С. С. Р.

СЭРАДА
4 лістапада 1931 г.
№ 256 (3345)

І-б. "Савецкая Беларусь"
Москва, Моховая, 6 Публичной библиотеке СССР им. Ленина
отд. обмен. адвін экз.

## За большавіцкае правядзеньне перавыбараў ФЗМК

Дзьве дэкады прайшло з таго часу, як на старонках друку быў апублікаваны зварот УсеЦСПС да ўсіх рабочых і работніц Савецкага саюзу аб перавыбарах фабзаўмясцкомаў. Гэты вялікай палітычнай важнасьці дакумант накіраваны на далейшае развіцьцё палепшаньне работы прафсаюзаў і іх нізавых прафарганізацый.

Прафсаюзы БССР, упарта працуючы над выкананьнем пастановы партыі і 5-га пленуму УсеЦСПС, перамагаючы недахопы ў рабоце, якія былі адзначаны ў мінулым годзе ў пастанове Бюро ЦК КП(б)Б, з значнымі дасягненьнямі прышлі да чарговай перавыбарчай кампаніі фабзаўмясцкомаў.

За апошнія гады ў сацыялістычную прамысловасьць БССР уцягнуты новыя сотні тысяч маладых пралетарыяў — жонак рабочых, калгасьнікаў, бядняхоў і сераднякоў. Колькасьць рабочых на прамысловасьці ВСНГБ за 8 месяцаў 1931 г. у параўнаньні з мінулым годам узрасла на 19,1 проц.

Такіх шпаркіх тэмпаў разьвіцьця ня ведае ніводная буржуазная краіна. Гэты рост набывае яшчэ больш вялікае значэньне на фоне вялізарнейшага крызісу ва ўсім капіталістычным сьвеце. На вуліцу выкідаюцца мільёны беспрацоўных.

Толькі Савецкі саюз, у тым ліку і БССР **ня велае беспрацоўя.** Матар'яльна - бытавое становішча рабочай клясы Савецкага саюзу паляпшаецца з кожным днём, значна ўзрасла заработная плата рабочых, ёсьць вялікі зрух у справе абслугоўваньня рабочай масы, у палепшаньні рабочага забесьпячэньня, грамадзкага харчаваньня, у справе задавальненьня культурных патрэб рабочай клясы. Гэта ў той час, калі ў капіталістычных краінах ідзе шалёны наступ на скарачэньне заработнай платы рабочым.

Прафсаюзы БССР пад кіраўніцтвам КП(б)Б за апошні шэ праравілі вялікую работу ў набліжэньні прафработы да цэху, брыгады, да кожнага вытворчага зьвяна. Значна ўзрасла актыўнасьць і ўдзел рабочых у вытворчым плянаваньні (укараненьне зьменна - сустрэчных плянаў, рэгулярных вытворчых нарад і г. д.). Тысячы лепшых ударнікаў перададзены ў рады камуністычнай партыі.

Побач з даасягненьнямі, якія маюцца ў прамысловасьці БССР, аб'яднаньні ВСНГБ свой прамфінплян на сёньняшні дзень недавыканалі. Выкананьне праграмы за 9 месяцаў работы (студзень - кастрычнік) па аб'яднаньнях ВСНГ складае толькі 86,2 проц. Горш абстаіць справа з выкананьнем якасных паказьнікаў і зьнижэньнем сабекошту. Па радзе галін прамысловасьці замест зьнижэньня сабекошту ёсьць павялічэньне яго (фанэрная, шкляная, запалкавая, тэкстыльная і лёнапрадзільная).

Высунутыя тав. Сталіным шэсьць умоў «на новаму працаваць, па новаму кіраваць», цалкам датычацца і прафсаюзных арганізацый. Між тым ажыцьцяўленьне шасьці умоў таварыша Сталіна праводзіцца нездавальняючымі тэмпамі. Яшчэ і да сёньняшняга дню гаспадарнікі і прафработнікі пасобных прадпрыемстваў не ад мовіліся ад самацёку, не перайшлі да арганізаванага набору рабочых, недастаткова перабудавалі заработную плату, поўнасьцю не ліквідавалі дробна - буржуазную ўрэдніпаўку, абязьлічку, не ўкаранілі гаспадарчы разьлік, не ўвялі прэм'яльна - прагрэсыўнай зьдзельшчыны і г. д.

Перавыбары фабзаўмясцкомаў у БССР зараз ужо разгарнуліся ў шырокую палітычную кампанію, якая захапляе вялічэзныя масы рабочых. Кожны дзень прыносіць усё новыя і новыя довады аб адданасьці рабочай клясы і працоўных мас генэральнай лініі партыі. Асноўныя лёзунгі справа здачча - перавыбарчай кампаніі паказаныя ў звароце УсеЦСПС рабочымі хутка падхапляюцца і ператвараюцца ў жывую рэальную справу. Тыя пматлікія лісты, якія мы атрымліваем з заводаў і фабрык, красамоўна сьведчаць аб вялізарнейшым працоўным уздыме. Растуць ударныя і гаспадарча - разьліковыя брыгады. падвышаецца прадукцыйнасьць працы, ажыцьцяўляюцца канкрэтныя мерапрыемствы па палепшаньні сацыяльна - бытавога абслугоўваньня рабочых мас. Перад заводзкімі прафарганізацыямі зараз паўстае сур'ёзнейшая задача аб замацаваньні і далейшым разгортваньні гэтай новай хвалі працоўнага ўздыму і творчай актыўнасьці рабочай масы.

Рад прафарганізацый БССР ужо ў першыя дні перавыбараў здолеў скарыстаць перавыбары для ўцягненьня рабочых у рады прафсаюзаў, у рады КП(б)Б і камсамол. У часе перавыбараў наглядаецца вялікі рост радоў ударнікаў, гаспадарча - разьліковых брыгад, прыплыў рабочых прапаноў і г. д. (завод «Камунар», «Варашылава», саюзы Нархарч, керамічнай прамысловасьці, лесдрэўрабочых і г. д.).

Аднак ёсьць шмат такіх прафарганізацый у БССР, якія не забясьпечылі належным апэрацыйным кіраўніцтвам і масавасьцю перавыбары ФЗМК, якія і да гэтага часу яшчэ ня прыстулілі да работы, чакаючы нейкіх дадатковых дырэктыў.

Пастанова ЦК КП(б)Б, якая надрукавана ў газэце «Савецкая Беларусь» ад 26 кастрычніка г. г., ставіць перад усімі партыйнымі арганізацыямі, у сувязі з перавыбарамі ФЗМК, цэлы рад важнейшых задач па ўзмацненьні партыйнага кіраўніцтва прафсаюзнай работай. «Забясьпечыць штодзённае канкрэтнае кіраўніцтва, дапамогу і актыўны ўдзел членаў партыі і камсамолу ў правядзеньні масава - палітычнай кампаніі перавыбараў фабрычна - заводзкіх камітэтаў, сэкцыі ІТР, мясцкомаў, і студзянскіх прафарганізацый, накіроўваючы разгортваньне кампаніі на далейшую перабудову работы прафсаюзаў тварам да вытворчасьці, арганізуючы рабочыя масы на поўнае выкананьне асноўных умоў, вызначаных у прамове таварыша Сталіна і адозьве УсеЦСПС».

Трэба ўлічыць недахопы мінулагодніх перавыбараў ФЗМК і прыцягнуць да актыўнага ўдзелу ў правядзеньні сучаснай кампаніі гаспадарнікаў, якія пры салдэйнічаньні ўсёй заводзкай грамадзкасьці павінны накіраваць творчую актыўнасьць мас на вырашэньне важнейшых гаспадарчых пытаньняў прадпрыемстваў.

Прафсаюзныя і гаспадарчыя арганізацыі павінны цьвёрда памятаць аб тым, што нашы вытворчыя пляны і заданьні зводзяцца ня толькі да пераліку лічбаў і заданьняў, а нашы вытворчыя пляны «ёсьць жывыя і практычная дзейнасьць мільёнаў людзей». Па гэтэму, клапоцячыся пра выкананьне пляну, трэба клапаціцца і аб тых, намаганьнямі, якіх выконваюцца гэтыя пляны. Трэба памятаць словы правадыра партыі аб тым, «што наш савецкі рабочы жадае жыць з пакрыцьцём усіх сваіх культурных і матар'яльных патрэб, ён на гэта мае права і мы абавязаны забясьпечыць яму гэтыя ўмовы».

## Да адказнасьці зрыўшчыкаў

### Зараз-жа выканаць плян адгрузкі бульбы Ленінграду

Ня гледзячы на апошнія дырэктывы партыі і ўраду аб фарсаваньні тэмпаў адгрузкі бульбы Ленінграду, гэтая работа ня толькі не ўзмацнілася, але наадварот, нават паслабла. Лічбы, якія паказваюць адгрузку бульбы за апошнюю пяцідзёнку кастрычніка значна меншыя чым лічбы адгрузкі ў сярэдзіне месяца. Калі, напрыклад, за пяцідзёнку з 11 па 16 кастрычніка было адгружана 28509 тон, дык з 25 па 1 лістапада было адгружана толькі 21002 тон. Загатоўчыя арганізацыі, не выключаючы з гэтага ліку і цэнтральныя (Белкаапсаюз, Белплодгародніна, Белсадсаюз, Белхлебжывёл саюз, Беллёнсаюз) яшчэ не ўявілі сабе ўсяго вялізарнага палітычна-гаспадарчага значэньня адгрузкі бульбы. Работа па арганізацыі адгрузкі яшчэ ў значнай меры праводзіцца самацёкам, без належнага вучоту і кіраўніцтва.

Аднак загатоўчыя арганізацыі, якія да 1 лістапада прышлі з недавыкананьнем пляну адгрузкі бульбы, імкнуцца прыкрыць сваю бязьдзейнасьць цэлым радам «аб'ектыўных» прычын, імкнуцца зваліць з сябе віну на кагось там ні было (аж да «бюро надвор'я», якое «падзяло» з надыходам халадоў і «нечаканай» восеньню, нібы восень павінна пачацца не ў кастрычніку, а ў студзені, ці лютым), абы толькі самім застацца «чыстымі» у гэтай справе.

— Мы ўжылі ўсе заходы—крычаць кіраўнікі загатоўчых арганізацый як у цэнтры, так і на мясцох.—Нашы ўсе працаўнікі на раёне. Ва ўстановах засталіся толькі некалькі тэхпрацаўнікоў. Пішам тэлеграмы, звоним па тэлефоне і г. д. і г. д.

Аднак калі ўгледзецца ў сапраўднае становішча рэчаў, дык атрымліваецца, што ў значнай частцы «заходы» ўжыты толькі «для справаздачнасьці» Пасылка вялікай колькасьці працаўнікоў у раёны ня толькі не падшпурхнула справы, але, наадварот, толькі пагоршыла становішча. Значная частка выехаўшых на раён працаўнікоў зусім мала робіць, каб прасунуць там справу бульбаадгрузкі, а больш займаецца зьбіраньнем розных лічбаў і зводак і зусім непатрэбнай перапіскай.

Для прыкладу можна прывесьці Слуцкі раён, дзе ня гледзячы на наяўнасьць «прадстаўнікоў з цэнтру» прастоі, дарэмная перагонка і недагрузка вагонаў прысланых для адгрузкі бульбы ўвайшло ў сыстэму, дзе здатчыкі бульбы і чырвоныя абозы, чакаючы прыёму бульбы, прастойвалі цэлымі днямі, працілі гэтым дарагі рабочы час, дзе 31-Х з паданых пад бульбу 40 вагонаў загрузілі толькі 2, ды тыя «забыліся» на ноч зачыніць і бульба адпраўлена значна папсаваная марозам.

Такіх прыкладаў можна прывесьці вельмі многа, аднак ўсё гэта не перашкаджае загатоўчым арганізацыям, б'ючым сабе ў грудзі, «шчыра» заяўляць:

— Мы зрабілі ўсё магчымае, нашы ўсе людзі на раёне. Больш і паслаць няма каго.

Па сутнасьці справы такая рассылка працаўнікоў у раёны зьяўляецца ні чым іншым, як самастрахаваньнем гэтых арганізацый, імкненьнем зьняць з сябе адказнасьць за даручаную работу, абязьлічыць гэтую работу.

Характарным для сьцьярджэньня гэтага палажэньня зьяўляецца работа па адгрузцы бульбы ў тых раёнах, дзе адгрузка праводзіцца двума загатоўчымі сыстэмамі. У Слуцкім раёне, як ужо зазначана вышэй, сыстэматычна з дня ў дзень нескарыстоўваюцца вагоны паданыя пад бульбу. Аднак Белплодгароднінна, якая вядзе там адгрузку, сябе ў гэтым вінаватай ня лічыць.

Загатоўку праводзіць сыстэма сель гаскаапэрацыі. Прычым-жа мы, калі яны (гэта значыць загатоўцы ад сель гаскаапэрацыі) нам ня прывезьлі бульбы, — заяўляюць прадстаўнікі Белплодгародніны.

Сыстэма сельгаскаапэрацыі ў сваю чаргу таксама «не вінавата».

— Вінавата калгасная сыстэма і сельсаветы, — яны ня прывезьлі бульбы.

Калгасы звальваюць віну на наадвор'е, дрэнную дарогу, недахват рабочай сілы і г. д.

Зразумела, што ні дарога, і ні надвор'е, а апартуністычная бязьдзейнасьць, нежаданьне і няўменьне загатоўчых арганізацый працаваць, спа дзяваньне на самацёк і самастрахоўка, якая яшчэ ня зжыта з практыкі загатовак і адгрузкі бульбы, неразуменьне, ці нежаданьне разумець палітычна - гаспадарчай важнасьці сваяго часовага забесьпячэньня рабочых цэнтраў бульбай, зьяўляецца сапраўднымі прычынамі ганебнага прарываў.

Вучот выкананьня пляну адгрузкі бульбы наладжаны зусім дрэнна, ня гледзячы на тое, што адносна наладжаньня вучоту ў свой час былі даны досыць выразныя і катэгарычныя дырэктывы. Белкаапсаюз, напрыклад, і да сёньняшняга дня ня вылучыў нават працаўніка, які адказваўбы за пастаноўку вучоту. У вучоце ходу загатовак і адгрузкі бульбы шмат блытаніны. Разыходжаньне ў лічбах зводак доходзіць да дзесяткаў процэнтаў. Бязумоўна і гэта зьявішча ёсьць ня што іншае, як непасрэдны выраз дрэннага апэрацыйнага кіраўніцтва загатоўкамі з боку загатоўчых сыстэм.

«Самацёчныя» настроі ў правядзенні бульбазагатоўчай кампаніі, якія на глядаюцца з боку цэнтральных загатоўчых арганізацый перадаюцца і нізавым іх сеткам. Невыкананьне ў тэрмін пляну адгрузкі бульбы Ленінграду ў першую чаргу залежыць ад кіраўніцтва правядзеньнем бульбазагатовак і адгрузкі з боку цэнтральных загатоўчых арганізацый.

Бязумоўна гэта ні ў якім разе не апраўдвае раённых і сельскія арганізацыі тых раёнаў, якія вельмі адсталі ў выкананьні пляну адгрузкі, якія не мабілізавалі вакол гэтага пытаньня грамадзкай думкі, не праявілі належнай арганізацыйнай работы.

Поруч з блёкучымі вынікамі ўдарна правядзеньня адгрузкі бульбы перадавых раёнаў (Полацкі—181,0 проц. заданьня; Плешчаніцкі—138,0 проц., Барбуйскі—115 проц., Сураскі—100 проц.) трэба адзначыць ганебнае адлегаваньне якое мяжуецца са зрывам адгрузкі па цэлым радзе раёнаў. Так, на 1 лістапада Лепьчынскі раён плян адгрузкі выканаў усяго на 18,6 проц., Чуваскі—на 27,2 проц., Старобінскі—30,4 проц., Лоеўскі—30,4 проц. Рэчыцкі—30,8 проц., Ельскі 32,8 проц., Б.-Канцалёўскі—35,2 проц., Клічаўскі—36,1 проц., Мазырскі 38,2 проц. і г. д.

Гэтыя раёны проста недаацэнілі палітычна-гаспадарчай важнасьці бульбы адгрузкі. Партарганізацыі гэтых раёнаў зусім мала зрабілі па сканцэнтраваньні ракол забесьпячэньня бульбай пралетарскіх цэнтраў увагі калгаснікаў і бядняцка-серадняцкай часткі аднаасобнікаў. Належнага націску на кулацка-заможную частку ня было зроблена і гэта дало магчымасьць кулакам і заможнікам разбазараць бульбу, ня выкананьне давядзенных да іх гаспадарак цэнтрэдных заданьняў.

Усё гэта ў выніку дало па БССР невыкананьне пляну адгрузкі бульбы Ленінграду.

Аднак трэба канстатаваць, што на адстаўшыя ў адгрузцы арганізацыі факт невыкананьня ў тэрмін пляну адгрузкі не зрабіў някага ўплыву. Вынікі адгрузкі да 1 лістапада зусім ганебныя. Мала таго, што на 1 лістапада адгружана ўсяго толькі 1964 тоны (за дзень), але да гэтага трэба яшчэ дадаць і начуваны простой недагружаных вагонаў. 2 лістапада па БССР з паданых пад бульбу вагонаў адпраўлена на 123 недагружаныя.

Гэта гаворыць ня толькі аб паўнейшай бездапасьнасьці загатоўчых арганізацый за даручаную ім справу, але зрывае работу транспарту ў такія адказны пэрыод, як асеньняя перавозкі. Па гэтай безадказнасьці, якая фактычна зьяўляецца злачынствам, трэба моцна ўдарыць. Вінаватыя ў незагрузцы 123 вагонаў павінны панесьці адпаведную адказнасьць, як зрыўшчыкі важнейшых мерапрыемстваў партыі і ўраду.

Трэба зараз рашуча ўзьняць тэмпы адгрузкі бульбы. Прыймовыя і адгрузачныя пункты павінны працаваць удзень і ўночы. Над правядзеньнем ад грузкі трэба ўзмацніць грамадзкі кантроль, дабіцца таго, каб паданыя для адгрузкі вагоны не прастойвалі ніводнай лішняй хвіліны.

«Па разацкіх настроях, па кулацкіх тэндэнцыях затрымаць у сябе прадукцыю трэба нанесьці руйнуючы, бальшавіцкі ўдар» (са звароту ЦК КП(б)Б). Трэба дабіцца таго, каб у першую-ж пяцідзёнку лістапада паўнасьцю ліквідаваць запазычанасьць перад ленінградзкім пралетарыятам.

**М. П-скі.**

## Ніжня-Гародзкі аўта-гігант уступае ў строй 518

### Нижні Новгород, аўтазавод, Тыцеву, Царэскаму, Кузьнецову

**Шчырае прывітаньне рабочым і адміністрацыйна-тэхнічнаму пэрсаналу будоўлі з прычыны пасьпяховага скончэньня будаўнічых работ заводу.**

**З ПЕРАМОГАЙ, ТАВАРЫШЫ!**

**Жадаем вам далейшых посьпехаў у справе мантажу, наладкі і пуску заводу—волата. Не сумняваемся, што здолееце перамагчы ўсе труднасьці і з гонарам выканаеце свой доўг перад краінай.**

**І. СТАЛІН, В. МОЛАТАЎ.**

## Забастоўка партовых рабочых у Гамбургу

ГАМБУРГ. 2-XI. Сёньня пачалася частковая забастоўка партовых рабочых. Учора на сходзе партавікоў, на якім абгаворвалася рашэньне трацейскага суда аб скарачэньні заработку, было прынята рашэньне зьвярнуцца да ўсіх партовых рабочых з заклікам абвясьціць, згодна рашэньня 85 проц. усіх партовых рабочых, усеагульную забастоўку. Адначасова рэфармісты апублікавалі штрэйкбрэхерскую адозву да партавікоў. На біржы працы бес працоўныя—партовыя рабочыя не зьяўляюцца з салідарнасьці з бастуючымі. Рабочыя буйных транспартных фірм «Лоўдзінг», «Нільсэн» і інш. сёньня ня выйшлі на работу. Многія сацдэмакратычныя рабочыя — члены рэфармісцкага прафсаюзу бастуюць разам з рэвалюцыйнымі партавікамі.

Партавікі асуджаюць урад і рэфармісцкіх прафбюракратаў і выказваюцца за забастоўку, адхіляючы ўсякія перамовы з прадпрыемцамі. Штрэйкбрэхерскія лістоўкі рэфармісцкіх прафбюракратаў з абурэньнем рвуцца і тых, хто распаўсюджвае гэтыя лістоўкі, рабочыя праганяюць з гавані. На біржах працы ў Гафэнторы і Штубенхуку ў сувязі з забастоўкай, была спынена пасылка партавікоў на работу. Частка рабочых буйнага параходнага т-ва «Гамбургаюд» далучылася да бастуючых.

***

БЭРЛІН, 2-XI. Учора па сходзе нямецкай народнай партыі лідэр гэтай партыі буйны прамыслоўца Дзінгельдэй у сваёй прамове адкрыта заклікаў пасьледаваць прыкладу Англіі і стварыць у Нямеччыне нацыянальны ўрад.

### Тэрор супроць бастуючых маракоў

БЭРЛІН, 2-XI. Як паведамляюць з Куксгмафэну, 13 матросаў парахода «Вэйсэ Зэе», які прыбыў з Ленінграду, прысуджаны да аднаго месяца турэмнага зьняволеньня за ўдзел у забастоўцы.

### Фашысцкія банды ўзбройваюцца

БЭРЛІН, 3-XI. Паводле паведамленьня камуністычнай «Гамбургер фольксцэйтунг» арыштаваны 3 майоры рэйхсвэру ў Кулані і кіраўнік нацыяналістычнай партыі ў Фленсбургу Бланк за арганізацыю праз салдат рэйхсвэру раскраданьняў вялізарнай колькасьці вайсковага абмундзіраваньня, стрэльбаў, амуніцыі і г. д.

Пакрадзеная вайсковая амуніцыя прадавалася «Сталёваму шлему» і штурмовым атрадам.

***

БЭРЛІН, 3-XI. Прускі міністр унутраных спраў сацыял-дэмакрат Зэвэрынг забараніў учора на падставе надзвычайнага дэкрэту ўсе мітынгі і дэманстрацыі пад адкрытым небам. Гэтая забарона датычыцца ў першую чаргу дэманстрацый кампартыі, рэвалюцыйнай прафапазыцыі і пралетарскіх масавых арганізацый у сувязі з XIV гадавінай Кастрычніцкай рэвалюцыі.

***

БЭРЛІН, 3-XI. Камуністычная газэта ў Магдэбургу «Трыбуна», якая выйшла гэтымі днямі пасьля 4-тыднёвай забароны, зноў забаронена на 4 тыдні. Рэдактар камуністычнай газэты ў Цюрынгіі «Цюрынгер Фольксблят»—Дзюнобэйль прысуджаны да 9 месяцаў зьняволеньня ў цытадэлі за падрыхтоўку дзяржаўнай здрады.

### Бэнэш аб прызнаньні СССР

ПРАГА, 2-XI. У сваёй прамове ў бюджэтнай камісіі Чэха-славацкага парляманту 31 кастрычніка міністр замежных спраў Бэнэш заявіў па пытаньні аб прызнаньні Чэха-Славакіяй СССР: «У лічу, што палітыка, якая на працягу апошніх год праводзілася ў гэтым пытаньні, няправільная. Я думаю, што ўзаемаадносіны паміж Чэха-Славакіяй і СССР павінны, нарэшце, зрабіцца нармальнымі. Аднак, я лёйяльна праводзіў тую палітыку, якая была неабходна большасьці ў парляманце».

### Японскія імпэрыялісты адхіляюць і думкі аб эвакуацыі з Манчжурыі

#### Аб сэрыі нотамі паміж Нанкінам і Японіяй

ТОКІЕ, 3-XI. Кітайскі пасланец у Японіі Чжан-Цзо-Лін у ноце да японскага ўраду паведамляе аб назначэньні кітайскіх прадстаўнікоў для «прыняцьця розных раёнаў усходніх правінцый». (Манчжурыя) пасьля эвакуацыі японскага войска, згодна рашэньня Лігі Нацый ад 24 кастрычніка.

Чжан-Цзо-Лін паведамляе таксама, што нанкінскі ўрад гатовы для перагавораў аб «дэталях» эвакуацыі і перадачы вызваляемых мясцовасьцяй і «спадзяецца», што японскі ўрад ня трацячы часу, назначыць прадстаўнікоў для ўдзелу ў перагаворах». Нота адзначана 27-ым кастрычніка.

Адказ Сідэхара, які агалошваецца сёньня з нотай Чжан-Цзо-Ліна, пачынаецца зазначэньнем: «24 кастрычніка Ліга Нацый ня прымала гэткай рэзалюцыі, паданай у ноце Чжан-Цзо-Ліна». Што датычыцца эвакуацыі і перадачы мясцовасьцяў, дык пункт гледжаньні японскага ўраду,—заявчаецца ў адказе,—выкладзены ў папярэдняй ноце Сідэхара (аб «гарантыі безапаснасьці» і заключэньні дагавораў), а таксама ў папярэдняй дэклярацыі ад 26 кастрычніка. «Таму, ад казвае Сідэхара, — японскі ўрад спадзяецца, што кітайскі ўрад згадзіцца з японскім пунктам гледжаньня ў выніку чаго хутка змогуць пачацца перагаворы аб асноўных прынцыпах, рэгулюючых адносіны паміж дзьвюма краінамі, а таксама і па пытаньні аб эвакуацыі».

### Абгаварэньне савецкага пра кту аб эканамічным ненападзе

БЭРЛІН, 2-XI. Як паведамляюць з Жэнэвы, там сёньня а 11 гадзіне раніцы адкрылася сэсія спэцыяльнай камісіі эўрапэйскай камісіі па вывучэньні савецкага праекту пакту аб эканамічным ненападзе. У сэсіі ўдзельнічаюць 18 эўрапэйскіх і 7 ўнеэўрапэйскіх краін: СССР, Нямеччына, Бэльгія, Гішпанія, Эстонія, Італія, Фінляндыя, Францыя, Англія, Грэцыя, Латвія, Польшча, Румынія, Швэйцарыя, Чэха-Славакія, Турцыя і Югаславія, Аўстралія, Канада, Чылі, Кітай, Індыя, Японія і Уругвай.

Як вядома, Ліга Нацый на падставе рашэньня пленуму Лігі, запрасіла ПАЗШ да ўдзелу ў работах камісіі. Аднак, ПАЗШ адмовіліся прысылаць дэлегата ў Жэнэву, спасылаючыся на сваю незацікаўленасьць у даным пытаньні.

### Напярэдадні XIV гадавіны Кастрычніка

КІЕЎ, 3-XI. Рабочыя і ІТР заводу «Чырвона гута» ў падарунак да XIV гадавіны Кастрычніка вырашылі праблему вытворчасьці шкляных банак для кансэрваў. Іспыт гэтых банак давёў іх перавагу перад маталёвымі банкамі.

***

МАСКВА, 3-XI. Мабілізаваўшы на барацьбу за выкананьне пляну сяўбы азімых шырокія калгасныя масы на аснове разгорнутага сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва, МТС у асноўным закончылі сяўбу азімых. Да 1-га лістапада баявое заданьне ў 9 мільёнаў га азімых выканана цалкам. МТС паасобных зернявых раёнаў сяўбу азімых закончылі з вялікім перавышэньнем пляну.

МАСКВА, 2-XI. 2-га лістапада ў Маскву прыбыла для ўдзелу ў сьвяткаваньні XIV гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі першая група дэлегацыі амэрыканскіх рабочых. Прыехала 8 чалавек. Гэтымі днямі прыбудзе другая частка дэлегацыі.

## Аб ходзе першапачатковай апрацоўкі і здачы прадукцыі лёну і канапель

### Пастанова ЦК КП(б)Б

ЦК КП(б)Б прызнае, што:

1. Ход першапачатковай апрацоўкі лёну і канапель ва ўсіх раёнах праходзіць зусім нездавальняюча, у выніку чаго загатоўкі лёну і канапелі (валакна) амаль не распачаты і выканана на 25 кастрычніка толькі на 1,5 проц., пры чым сыравіна здаецца заводам нізкай якасьці.

У такім нездавальняючым становішчы знаходзіцца загатоўка ільнонасеньня і канапель (на 25-X—30,6 проц. гадавога пляну).

ЦК прапануе ўсім партыйным арганізацыям пры правядзеньні ільнозагатовак улічыць вопыт загатоўчай кампаніі бягучага году і зьвярнуць асаблівую ўвагу на своечасовае і поўнае выкананьне абавязацельстваў з боку калгасаў і саўгасаў.

Раённыя партыйныя арганізацыі, асабліва ільнаводных раёнаў, да гэтага часу не перабудавалі сваёй працы і не мабілізавалі работнікаў МТС, калгасьнікаў і аднаасобна-бядняцка-серадняцкіх гаспадарак на выкананьне пляну першапачатковай апрацоўкі лёну і канапель у вызначаны тэрмін, чым ставіцца пад непарэдную патрозу своечасовае выкананьне пляну загатовак. У большасьці калгасаў не распрацаваны канкрэтныя калідарныя пляны ўнезаводзкай апрацоўкі лёну і канапель у здачы дзяржаве таварнай прадукцыі, ня ўведзена зьдзельшчына; зусім слаба разгорнута сацпаборніцтва і ўдарніцтва; праца па апрацоўцы лёну і канапель ня ўвязваецца з асноўнымі мерапрыемствамі па арганізацыі гаспадарчага ўзмацненьня калгасаў; маюцца выпадкі разьмеркаваньня валакна паміж калгасьнікамі да здачы (продажы) таварнай прадукцыі Дзяржаве (Хойнікі, Брагін).

Да гэтага часу ня зключаны соцдагавары паміж прамысловымі прадпрыемствамі, перапрацоўваючымі лён, з ільнаводнымі раёнамі і асобнымі калгасамі аб хутчэйшай перапрацоўцы ільну і канапель і здачы (продажы) іх у адпаведнасьці з кантрактацыйнымі дагаварамі.

2. Ня гледзячы не неаднаразовыя пастановы ЦК КП(б)Б і СНК пра тэмпы будаўніцтва ільнязаводаў, да гэтага часу не скончана будаўніцтва нават заводаў першай чарговасьці. Прычынамі такога маруднага будаўніцтва ЦК лічыць:

а) перапарадзіцельнасьць Белільнокаапзаводбуду,

б) недастатковая ўвага з боку адпаведных РК і РВК і

в) бюрократычныя адносіны забясьпечваючых арганізацый (Белдзяржснаб) да своечасовага забесьпячэньня будаўнічымі матар'яламі.

3. Значная частка прамтавараў, вызначаных для стымуляваньня ільнязагатовак фактычна на месцы, ня завезена. Маюцца шматлікавыя выпадкі абязьлічваньня гэтых тавараў і выдаткаваньня іх на іншыя мэты.

Выходзячы з такога становішча ЦК КП(б)Б **пастанаўляе:**

1. Зьвярнуць увагу РК, РВК, зямельных, калгасных, і загатавіцельных арганізацый саўгасу і МТС, што апрацоўка ільну і канапель і своечасовае выкананьне пляну загатовак тэхкультур зьяўляецца, на раду з вывазам бульбы, мяса і збожжазагатоўкамі, на бліжэйшы час важнейшай гаспадарча-палітычнай задачай на вёсцы.

У адпаведнасьці з гэтым, павінен быць неадкладна мабілізаваны на выкананьне паказаных задач увесь раённы партыйны і савецкі актыў. Асабліва ў сувязі з праходзячай кампаніяй перавыбараў парторганаў, ячэйкі КП(б)Б павінны мабілізаваць увагу ўсіх камуністычных рабочых, калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў аднаасобнікаў на выкананьне гэтае вышэйшае задачы, узмацніўшы штодзённае кіраўніцтва работай на апрацоўцы і нарыхтоўцы ільнавалакна і пяньку.

Павінна быць абвешчана самая рашучая барацьба супроць апартуністычнай недаацэнкі значэньня ільнозагатовак і своечасовай апрацоўкі ільна; супроць разацтва, укрываньня ільна ад Дзяржавы і кулацкай агітацыі, накіраванай на зрыў ільнозагатовак.

Ні ў якім разе не павінна быць дапушчана памылка мінулага году, якая выявілася ў недаацэнцы значэньня ільнозагатовак, якая прывела, у выніку крайняй зацяжкі ільнозагатавіцельнай кампаніі, да значнага недавыкананьня пляну загатовак.

2. З прычыны наступленьня рашаючага перыяду апрацоўкі ільну і канапель, выкананьня загатавіцельных пляну і здачы дзяржаве—ЦК КП(б)Б пастанаўляе абавязаць месячнік з 10-XI па 10-XII-г. г. На працягу месячніка павінна быць апрацована і здадзена (прадана Дзяржаве) уся вызначаная да здачы, згодна ранейшых пастаноў, колькасьць ільнавалакна (70 проц.).

3. Абавязаць НКЗем, Колгасцэнтр, РК і РВК, ня чакаючы пачатку месячніка, зараз-жа прыступіць да перабудовы ўсёй працы калгасаў, саўгасаў МТС і раённых арганізацый і забясьпечыць неадкладны пералом у ходзе апрацоўкі і здачы ільну і канапель.

4. Устанавіць такі парадак, каб апрацованая прадукцыя неадкладна здавалася ў межах кантрактацыйных дагавораў і загатавіцельных пляну дзяржаве.

Дабіцца рашучага пералому ў падвозе трасты і саломы заводам.

Лічачы зусім недапушчальным, наглядаючыся ў многіх мясцох факт—здачы заводам трасты і саломы дрэннай якасьці, прапанаваць РК, РВК, Райкалгассаюзам і Райкоопам зьвярнуць асаблівую ўвагу на якасьць здаваемай продукцыі.

НКСнабу ўстанавіць прэміяваньне за лепшую якасьць здаваемай прадукцыі.

5. Ускласьці адказнасьць за своечасовую апрацоўку ільну і канапель і выкананьне загатавіцельных пляну на ўпаўнаважаных ЦК і СНК нараўне з раённымі прадстаўнікамі.

6. Зараз-жа прыступіць да праверкі дачы цьвёрдых заданьняў кулацка-заможным гаспадаркам і спагнаньню па гэтым заданьням ў адпаведнасьці з тэрмінамі ўстаноўленымі Урадам, прымаючы рашучыя захады супроць кулацка-заможных гаспадарак, якія ім кукуцца скорыць ад дзяржавы і ўхіліцца ад выкананьня цьвёрдага заданьня, а таксама абкладаючы невыкананых штрафамі, прыцягваючы да крымінальнай адказнасьці, даючы рашучы адпор спробам кулакоў сарваць ільнозагатоўкі.

Неабходна ў той-жа час правесьці шырокую масавую работу сярод калгасьнікаў і бядняцка-серадняцкіх і ад насобных гаспадарак.

7 Колгасцэнтру, РК і РВК зараз-жа прыступіць да практычнай арганізацыі работ па апрацоўцы ільну і канапель у калгасах, на аснове зьдзельшчыны брыгаднага спосаба апрацоўкі і шырокага правядзеньня мэтадаў працы: сацпаборніцтва і ўдарніцтва.

Уся гэтая праца павінна быць самым цесным чынам увязана з іншымі мерапрыемствамі па арганізацыі гаспадарчага ўзмацненьня колгасаў. Неабходна практыкаваць заключэньне соцдагавораў паміж фабрыкамі і заводамі, перапрабліочым лён і канаплі з раёнамі, асобнымі колгасамі і саўгасамі, прадугледзеўшы пры гэтым аказаньне дапамогі калгасам і саўгасам з боку прамысловасьці шляхам інструктаваньня аб мэтадах лепшай першапачатковай апрацоўцы ільну, пасылкай рабочых брыгад і г. д.

З другога боку колгасы і саўгасы павінны па дагаворах з прамысловымі прадпрыемствамі, прыняць абавязак на своечасовую апрацоўку ільну і канапель і датэрміновай здачы (продажу) дзяржаве, а таксама прадугледзець здачу сыравіны падвышанай якасьці.

8. Наркамзему і саўгасным аб'яднаньням забясьпечыць своечасовую апрацоўку ільну і канаплі па саўгасам і здачы дзяржаве.

Адначасова, ні ў якім разе не павінна быць дапушчана недаацэнка значэньня адпаведнага сэктару ў выкананьні пляну загатовак ільну і канапі.

9. Ухваліць пастанову НКЗ і Колгасцэнтру аб падвышэньні расцэнак калгасьнікам па сушцы, мяцьці і трапаньні ільну і канапель і прапанаваць Райкомам КП(б)Б, РВК і МТС шырока ўжываць мэтады ўзаемадаўжэньня НКЗ і Калгасцэнтрам, адначасова забясьпечыць максімальную нагрузку мяльных і трапальных машын, устанавіўшы 2-х—3-х зьменную работу мяльна-трапальных пунктаў і поўнае скарыстаньне саматужных машын, шырока практыкуючы узаемадапамогу адстаючым колгасам шляхам перасоўкі ільнамяльных і трапальных машын.

У мэтах стымуляваньня своечасовага і поўнага выкананьня пляну па першай апрацоўцы ільну і канапель, а таксама здачы (продажу) дзяржаве таварнай прадукцыі, абавязаць Наркамснаб вызначыць спэцыяльны прамтаварны фонд для прэміяваньня колгасаў, МТС і асобных працаўнікоў за ўдарную работу па апрацоўцы і здачы ільну, асабліва ўлічаючы пры гэтым якасныя паказальнікі і найменьшы страты пры апрацоўцы ў мэтах найбольшага выхада таварнай продукцыі.

10. Даручыць т.т. Балціну (НКСнаб), і Хаскіну (БКСаюз) устанавіць асобны кантроль за своечасовым

# Глушыцеляў самакрытыкі, кулацкіх агентаў

## Жураўкевічаў, Баціяновых, Губароў, Саевічаў і Кашыных—да суровай адказнасьці

## СЛОВА—ЗА ПРАЛЕТАРСКІМ СУДОМ

Ударнік становіцца центральнай фігурай на заводзе, фабрыцы, саўгасе, МТС, калгасе. Іх сотні, тысячы, мільёны. Іх цэлыя армії расклены на небясьпечным абшары Саюзу.

Яны—гэта злучаная энэргія мільёнаў; яны жуюць, будуюць, капаюць земныя нэтры, калектывізуюць, замацоўваюць, арганізуюць працу па новаму, выкарчоўваюць карэньні капіталізму, закладаюць, будуюць падмурак сацыялізму.

Аб ударництве мы гаворым многа. І зусім недастаткова гаворым аб самых ударніках. Іх часта не заўважаюць, праходзяць міма.

***

Шамко Сьцяпан Зьмітраў. Гэта ўдарнік калгасных палёў Койданаўшчыны. Шамко з сялян-беднякоў, зараз член калгасу «Камінтэрн», лепшы яго ўдарнік. Шлях Шамко—гэта шлях жорсткай барацьбы з кулакамі і іх агентамі.

Шамко бядняк, адыходнік-лесаруб, з году ў год гібеў, чэрнуў на сваёй мізэрнай гаспадарцы, хоць і быў здольным цесьлярам, сталяром. Хлынута хваля калектывізацыі і Шамко—ў калгасе.

Але Шамко ў калгасе не радавы калгаснік, Шамко—ударнік, брыгадзір. Гэта ён з першага мая пару першае кастрычніка выпрацаваў 239 працадзён пры зьдзельшчыне. Гэта яго брыгада дала цьвёрдае слова ударніка скончыць будаўніцтва кароўнікаў да 14 гадавіны Кастрычніка чаго-б то ні стала.

І «калі-б не Шамко—заяўляе старшыня калгасу тав. Мэрын,—плян будаўніцтва ў калгасе быў-бы сарваны. Але дзякуючы яго энэргічнасьці, актыўнасьці, яго ўдарнай рабоце, будаўніцтва кароўнікаў будзе скончана да тэрміну».

Але гэтым ня вычэрпваецца асабістасьць Шамко. Шамко—член сельсавету, член рэвізійнай камісіі КСТУ, старшыня школьнай камісіі, член рэвізійнай камісіі калгасу; ён адзін з лепшых рабселькораў центральнага і раённага друку. Шамко адказны рэдактар насьценгазэты «Ключ Сацыялізму», якая паводле заявы старшыні сельсавету Івашына зьяўляецца «аднэй з лепшых на тэрыторыі Рубількаўскага сельсавету». Шамко, як рабселькор наскрозь прасякнут канкрэтным праяўленьнем у калгаснай вытворчасьці лёзунгам партыі—«кожны рабселькор—ударнік, кожны ўдарнік—рабселькор».

Гэта ён, рабселькор ударнік Шамко ў часе ўборкі стварыў у калгасе «Камінтэрн» апэрацыйна-вытворчую газэту штодзенку «Ударнік уборачнай».

І штодзенка «Ударнік уборачнай» пад яго кіраўніцтвам, пры агульнай дапамозе ўдарнікаў-рабселькораў калгасу, біла ў цэль, біла па балючых мясцох, маблізоўвала масы на барацьбу за калгасны ўраджай, падхапляла і паказала лепшых ударнікаў калгасніка ў, гнэбавала прагульшчыкаў, гультаёў, выкрывала кулацкія махінацыі як унутры калгасу, так і па-за калгасам. Газэта маблізавала масы. Штодзёнка вывешвалася на вуліцы, у полі. Моц друку адчувалася на кожным кроку.

Як трэба практычна ператвараць друк у сапраўдную зброю партыі, у рабселькора-ударніка Шамко могуць павучыцца ня толькі рабселькоры, гэтаму могуць павучыцца нават работнікі нашага друку. Сваю энэргію ўдарніка, сваю здольнасьць, клясавую сьвядомасьць рабселькор Шамко ўмела ўлучаў з вытворчымі працэсамі, пад парадкаваў іх агульнай мэце калгаснага будаўніцтва, барацьбе за арганізацыйна-гаспадарчае замацаваньне калгасу. І ў гэтай барацьбе Шамко кожны раз не забываўся накіроўваць вастрыё і моц друку на кулакоў і іх агентаў.

«Шамко ня толькі актыўны селькор і лепшы рэдактар насьценгазэты,—гаворыць настаўнік тав. Кахаеноўскі—ён асабліва праяўляе сябе як ударнік на будаўнічых работах калгасу. Шамко лепшы ўдарнік калгасу. Шамко надавы чайна таварка абгаворвае усе гаспадарчыя пытаньні калгасу, уносіць дзелавыя прапановы».

Зусім слушна, што т. Шамко прызнаны лепшым ударнікам-рабселькорам, лепшым калгасьнікам, лепшым брыгадзірам. І гэта ўдарніцтва селяніна бедняка, лепшага калгасьніка Шамко набывалася, выкоўвалася, загартоўвалася ім у жорсткай клясавай барацьбе з кулацтвам і яго агентурай. Усё новае, за што так змагаўся Шамко, на кожным кроку натыкалася на кулацкае супраціўленьне. Узброіўшыся клясавай пільнасьцю гэты калгасьнік, ударнік-рабселькор пачаў адбіваць атакі кулацтва. У гэтай барацьбе Шамко заўсёды трымаў у сваіх руках моцную зброю партыі—друк.

І ўрэшце перайшоў да канкрэтнага пытаньня: «ты, растуды тваю маць,—пачаў папражаць Саевіч,—многа абчым пішаш у газэту на Жураўкевіча, чаму ніколі не парадзіўся з намі?.. А зі дакумант на 75 мэтраў мануфактуры ды ўсё-ж такі я цябе пасажу...»

І як-бы ў такт Саевічу, крамнік Баціянаў на кожным кроку паўтараў: «жыць ня буду, калі не аддам пад суд Шамко Сьцяпана...» Над Шамко нависае чорная хмара, за ім пачынаюць ужо сачыць. Адзін раз ідучы са сходу, селькора Шамко натнаў Жураўкевіч, які раптам заявіў: «ну што ты ашчэ не пакінуў пісаць»? Усё «роўна забію...» і ў хуткім часе Жураўкевіч набыў сабе рэвальвэр.

### Як абараняў селькораў начміліцыі Губар

Адчуваючы, што ў паветры пахне порахам, Шамко зьвярнуўся з лістом у рэдакцыю «Калгасьнік Беларусі», у якім просіць дапамагчы яму ў барацьбе з кулацтвам, абараніць ад спробаў задушыць самакрытыку, паведамляе пра замах. Гэты ліст праз рад інстанцый прайшоў зноў у рукі нач. міліцыі Губару, таму самаму Губару, які ўжо мае вымову за нядбайныя адносіны да рабселькораўскіх спраў.

У Губара і на гэты раз хапіла верхагляцтва. Выкрыцьцё справы пра замах селькора Шамко было даручана міліцыянэру Лісоўскаму, які выехаў на месца ў Рубількаўскі сельсавет. З першых крокаў дазнаньня, міліцыянэр Лісоўскі ўстанавіў наяўнасьць замаху на селькора Шамко. Поруч з гэтым перад Лісоўскім паўстаў яскравы малюнак скрыўленьня клясавай лініі, злачынствы і г. д. Лісоўскі апэрэфіў, не давёў справу да канца. Ён зьвярнуўся за дапамогай да начальніка Губара.

Што сказаў на гэта Губар? Наконт гэтага дамо слова самому Лісоўскаму, які з асаблівай дакладнасьцю выкрывае твар Губара ў напісаным Лісоўскім на імя пракурора тлумачэньні.

**«12 верасьня г.г. начальнікам міліцыі, тав. Губарам мне быў даручаны селькораўскі допіс прысланы рэдакцыі «Калгасьнік Беларусі» аб ганеньні на селькора Шамко з боку старшыні Рубількаўскага сельспажыўтаварыства Жураўкевіча, крамніка Баціянава і вэгэтаўскага міліцыянэра Саевіча. Утварыўшы расьсьледваньне, мною было ўстаноўлена наступнае: старшыня сельспажыўтаварыства Жураўкевіч і крамнік Баціянаў трымаюць шчыльную сувязь з кулацтвам, забясьпечваюць іх прамтаварамі, разам з кулакамі сыстэматычна ашуканьствуюць. З Жураўкевічам і Баціянавым трымае шчыльную сувязь міліцыянэр Саевіч. Мною ўстаноўлена, што Саевіч займаецца п'янствам, па жандармскаму абыходзіцца з грамадзянамі ў часе допытаў, пагражаў арыштам селькору Шамко за тое, што ён піша допісы пра Жураўкевіча. Аб усім гэтым я давёў да ведама начальніку міліцыі тав. Губару і напрасіў парады, як даць далейшы ход справе. І т. Губэр загадаў: «паведамляе рэдакцыю аб тым, што факты ў адносінах да Жураўкевіча і Баціянова падцьвердзіліся, а ў адносінах міліцыянэра Саевіча не пацьвердзіліся, за выключэньнем грубых адносін да грамадзян. На міліцыянэра Саевіча напісаць заключэньне аб пераводзе на другі вучастак і на гэтым абмежавацца». З такім загадам начальства я не згадзіўся і ведаючы, што ў справе аб прасьледваньні селькора Шамко ёсьць крымінальны склад злачынства, калі прыехаў пам. нач. міліцыі тав. Бруй, я зьвярнуўся да яго і расказаў у чым справа. Тав. Бруй на кіраваў мяне з гэтай справай да пракурора».**

Лісоўскі.

Так выконваў начальнік міліцыі Губар дырэктывы партыі аб барацьбе за дзейсьнасьць друку. Тут ня толькі бнаравасьне, тут яўны паварот на шлях клясавага ворага.

### Справа знаходзіцца ў надзейных руках

Пасьля доўгіх мытарстваў, справа аб прасьледваньні селькора Шамко трапіла ў надзейныя рукі. Пракурор т. Кавалёнка, злавіўшы канец нітки разматаў увесь кулацкі клубок.

Яшчэ ня было суда, яшчэ нават ня скончана сьледства, а Губары, Саевічы, Івашыны сьпяшаюць «раскаяцца» яны бачце ўжо «прозрели», яны каюцца, прызнаюць «памылкі».

«Я прызнаю,—піша ў сваіх паказаньнях Івашын,—што паданая на селькора Шамко заява Жураўкевічам ,ёсьць яўнае ганеньне як на селькора актывіста... Даныя мною паказаньні па справе агітацыі Шамко супроць лесазагатовак я зьмяняю. Я прызнаю, што зрабіў вялікую палітычную памылку... Насьцежгазэта што выпускаў селькор Шамко вельмі добрая. Допісы ўсе адпавядаюць сапраўднасьці, за выключэньнем у якой напісана пра мяне...»

Давяраць паказаньням, а таксама і раскаяньням, гэтага кулацкага агента ўнутры партыі, мы ня зьбіраемся. Паказаная вытрымка намі дадзена выключна для характарыстыкі самога Івашына. А яшчэ ня так даўно ў першым сваім паказаньні гэты кулацкі «пакаяніх» на пастаўленае яму пытаньне—ахарактарызаваць Шамко як грамадзяніна заявіў: «гэта чалавек, які мажа (чытай піша ў газэту), мажа і мажа, і ў маіх вачох аўтарытэтам не карыстаецца...»

### Справа селькора Шамко—навука для партарганізацыі

Справа аб прасьледваньні ўдарніка Шамко зьяўляецца вурокам для Койданаўскай партарганізацыі. Гэта справа сьведчыць, што ў рабоце Рубількаўскага сельсавету і партячэйкі ня ўсё стаіць на належнай вышыні, што кулацтва і яго агентура вядуць контр-атакі на калгасы. І гэта сьцьвярджаецца тым, што на вачох Рубількаўскай партячэйкі на працягу доўгага часу праба скрыўлялася лінія партыі, сыстэматычна на заціскалася самакрытыка, прасьледваўся пралетарскі друк, утваралася зьдзек над ударнікам—селькорам.

Раённы камітэт партыі павінен зацікавіцца работай Рубількаўскай партячэйкі, праверыць наколькі яна стаіць на клясавых пазыцыях, як змагаецца за арганізацыйна-гаспадарчае замацаваньне калгасаў, наколькі партячэйка выконвала і выконвае дырэктывы партыі аб кіраўніцтве нізавым друкам і рабселькораўскім рухам, наколькі яна змагаецца за разгортваньне пралетарскай самакрытыкі.

У справе аб прасьледваньні рабселькора Шамко ўмяшалася пракуратура. Жураўкевічы, Баціяны, Івашыны і Саевічы, гэтыя кулацкія агенты, глушыцелі самакрытыкі, павінны атрымаць руйнуючы адпор. **Якуб Палящук.**

### „Дзіковіны" на кулацкім хутары

І невядома, што сталася-б з ударнікам Шамко ў яго няроўнай барацьбе з клясавым ворагам, калі-б на дапамогу яму не падаспеў пракурор тав. Кавалёнка. Перад намі справа аб прасьледваньні ўдарніка-рабселькора Шамко. Гэта справа з асаблівай яскравасьцю адлюстроўвае тыя працэсы, тыя формы клясавай барацьбы, якія мае і маюць месца зараз на вёсцы. У чым сутнасьць гэтай спрэчкі?

У 1931 годзе, Рубількаўскі сельсавет, Койданаўскага раёну ахапіла шырокая хваля калгаснага руху. Сельсавет становіцца на шлях сацыяльнай калектывізацыі. Вакол арганізацыі калгасаў разгараецца жорсткая клясавая барацьба. Кулацтва і яго агентура не здаюцца бяз бою. Яны павялі контратаку. Супраціўляючыся калгаснаму руху кулацтва працісае ва ўнутр калгасаў сваіх агентаў і праз іх пачынае ўзрываць калгасы з сярэдзіны.

З асаблівай яскравасьцю гэта барацьба адбываецца вакол калгасу «Камінтэрн». Кулацкая агентура пачынае праляз ць у нутро калгасу.

Адным з такіх агентаў зьяўляецца нехта Жураўкевіч Зянон. Жураўкевіч заможнік, блізкі прыяцель былых кулакоў Банькоўскіх. Пралезшы ў калгас «Камінтэрн» Жураўкевіч становіцца загадчыкам аднаго з аддзяленьняў калгасу. Стаўшы «калгасьнікам» гэты агент наладжвае шчыльную сувязь з кулацтвам і разам з імі пачынае весьці атаку на калгасы. Апроч агітацыі супроць калгасу, Жураўкевіч будучы загадчыкам аддзяленьня пачаў займацца канкрэтнай шкодная работай. За кароткі час свайго «гаспадараньня» ў аддзяленьні, Жураўкевіч перавалок частку маемасьці кулакоў Банькоўскіх іх жонкам, апошняю маемасьць разбазарыў, пакінуўшы ў спадчыну ад свайго «гаспадараньня» калгасу адны драбны ад калёс.

Старшыня Рубількаўскага сельсавету кандыдат партыі Івашын, страціўшы клясавы твар, пад уплывам Жураўкевіча, стаў на шлях кулацкай дзейнасьці. Вечары п'янак на хутары ў кулакоў Банькоўскіх, становяцца штодзённымі клопатамі Івашына. Апартуніст Івашын—гэта тыповы агент клясавага ворага ўнутры партыі. Аб гэтым сьведчыць уся яго дзейнасьць.

А дзейнасьць гэта набывае простатакі анэкдатычны характар. Чым не характарны хоць бы такі дакумант выданы Івашыным заможніку Жураўкевічу:

> **ДАВЕДКА.**
>
> «Дадзена гэта гр. Жураўкевічу Зенону жыхару пас. Каменнае аб тым, што яму сельсавет дазваляе выяўляць кулацтва па в. Жураўкі і праводзіць каб яны не праводзілі агітацыю супроць калектывізацыі».
>
> Івашын.
>
> 8-IV—31 г.

Так Івашын вёў барацьбу з кулацтвам, так Івашын замацоўваў арганізацыйна-гаспадарчае становішча калгасу.

### Жураўкевіч у ролі „каапэратара"

Ударнік-рабселькор Шамко ўзьнімае свой голас пратэсту супроць кулацтва. Шамко з усіх канцоў пачаў біць трывогу, пратэставаць супроць разбурэньня калгасу «Камінтэрн». Гэта ён, Шамко, пачаў лістамі закідаць раённыя ўстановы,—рэдакцыі центральных газэт, пачаў выкрываць кулацкія махінацыі. І ўрэшце допісы Шамко ўбы «дабіліся» дзейнасьці. Агульны сход калгасу «Камінтэрн» выкідае з калгасу Жураўкевіча.

Але Жураўкевіч не такі, каб здацца бяз бою, ён яшчэ сваё пакажа. Жураўкевіч едзе з апэляцыяй у райкалгасаюз. Там яго аднаўляюць у правох калгасьніка калгасу «Камінтэрн» і больш таго, па рэкамэндацыі старшыні сельсавету—сабутэльніка Івашына, Жураўкевіча прызначаюць старшынёй Рубількаўскага сельспажыўтаварыства. Знаходзячы сабе моцную апору ў раёне і сельсавеце, Жураўкевіч зьяўтаецца назад у ролі каапэратара. І ў хуткім часе Рубількаўскае сельспажыўтаварыства пад кіраўніцтвам «каапэратара» Жураўкевіча ператвараецца ў «кулацкую лавачку». У часе бытнасьці Жураўкевіча на чале сельспажыўтаварыства, а за прылажкам кулацкага агента крамніка—Баціянова,—у кулакоў ды заможнікаў зьявілася закуска, выпўка, цукер, мануфактура ды інш. дэфіцытныя тавары. Дэфіцытнымі таварамі ў першую чаргу пачалі забясьпечвацца кулакі, а потым калгасьнікі. Больш таго, гэтыя агенты кулака зусім выкрэсьлілі са сьпісу забясьпячэньня ўдарнікаў-калгасьнікаў. Ударнік Шамко, які ад цямна да цямна са сваёй брыгадай будаваў два кароўнікі, упарта змагаўся каб скончыць да тэрміну будаўніцтва— гэты ўдарнік-рабселькор паводле загаду Жураўкевіча быў пазбаўлены крамнікам Баціяновым усяго кіх тавараў.

«Гэтаму газэтнаму мазылу, брахуну, ня даць нічога з крамы»—такім быў той матыў на падставе якога гналі ўдарніка з крамы.

За тое Жураўкевіч выпісаў для сябе аж тры пазыкі кніжкі, а потым павыпісваў і для кулакоў, уключыўшы іх у сьпіс катэгорыі калгасьнікаў.

І каапэрацыйныя тавары па рознаму цяклі з крамы ў кулацкія куфры. Нічога дзіўнага, што ў часе вобыску ў кулачкі Банькоўскай Мальвіны знайшлі мяшок каапэрацыйнай войны, 16 мэтраў мануфактуры, 13 фун. пукру, 9 фунтаў мыла і інш. прамтавары. Ад яго гатовага аддзеньня ў гэтай кулачкі знойдзена столькі якім можна было апрануць 30 чал.

### „Контр-рэвалюцыянэра" Шамко судзяць за „антысавецкую агітацыю"

Неўгамонны Шамко ўсё пратэсту, выпускае газэты, бічуе, піша ў центральны друк. Адтуль адзін за другім плывуць допісы ў раён, з раёну ў сельсавет вучастковаму міліцыянэру Саевічу. Што-ж робіць з рабселькораўскімі допісамі Саевіч? Саевіч гэта Жураўкевіч, Баціяноў, плюс Івашын за сьпіной якіх—уся сьвіта кулацтва. Саевіч адзін за другім зьбіўчае рабселькораўскія допісы. Злачынствы, аб якіх пісалі селькоры—гэта ён сам Саевіч, Жураўкевіч і ўся кулацкая кампанія.

І каб пазбавіцца ад назойлівага селькора, Жураўкевіч і Івашын пачынаюць ставаць на Шамко / крымінальную справу.

Жураўкевіч ад свайго імя піша Койданаўскаму вучастку Леспрамгасу (пісаў, праўда, Івашын, падпісваў толькі Жураўкевіч) заяву, у якой гаворыцца што гр. Шамко сыстэматычна вядзе агітацыю супроць лесазагатовак, займаецца контр-рэвалюцыйнай дзейнасьцю, чым зрывае плян лесазвазак па Рубількаўскім сельсавеце. Заява гэта пачынаецца ўмяшаньнем у рэлігію і ўсё ж такі ня рэбе пасаджу"...

Спробы Жураўкевіча, Івашына вынішчыць Шамко судам як бачыце, не ўдаліся. У далейшым гэта кампанія пачынае дзейнічаць кожны ў пасобку маючы апульную мэту—пазбавіць чаго-б ні каштавала, тэрыторыю Рубількаўскага сельсавету ад селькора Шамко.

І першым, адкрыта, бяз усялякай цырымоніі, пачаў закліканьць да парадку селькора Шамко міліцыянэр Саевіч. Зьявіўшыся на кватэру да Шамко «пры сарака двух градусах» Саевіч на чаў дапытвацца наконт таго, ці мае ён, Шамко, нейкі дакумант на атрыманьне з каапэрацыі 75 мэтраў мануфактуры, дзе ён узяў гэты дакумэнт. І ўрэшце перайшоў да канкрэтнага пытаньня: «ты, растуды тваю маць,—пачаў папражаць Саевіч,—многа абчым пішаш у газэту на Жураўкевіча, чаму ніколі не парадзіўся з намі?.. А зі дакумант на 75 мэтраў мануфактуры ды ўсё-ж такі я цябе пасажу...»

І як-бы ў такт Саевічу, крамнік Баціянаў на кожным кроку паўтараў: «жыць ня буду, калі не аддам пад суд Шамко Сьцяпана...» Над Шамко нависае чорная хмара, за ім пачынаюць ужо сачыць. Адзін раз ідучы са сходу, селькора Шамко натнаў Жураўкевіч, які раптам заявіў: «ну што ты ашчэ не пакінуў пісаць»? Усё «роўна забію...» і ў хуткім часе Жураўкевіч набыў сабе рэвальвэр.

# ДА КАНЦА ВЫКАРЧАВАЦЬ

## кулацкія месьніцкія тэндэнцыі ў збожжазагатоўках

### З УСЁЙ РАШУЧАСЬЦЮ БІЦЬ ПА ПРАВЫХ АПАРТУНІСТЫХ—КУЛАЦКІХ— ДААПМОЖНІКАЎ

### першачар овая задача ўсіх партыйных арганізацый

### Рашуча выкарчаваць кулацка-месьніцкія тэндэнцыі

У выніку ўдарнай работы праведзенай некаторымі партячэйкамі па выканьні пляну збожжазагатовак рад сельсаветаў Магілеўшчыны дабіліся вялікіх посьпехаў у правядзеньні гэтай кампаніі. Так Вендарскі сельсавет суцэльнай калектывізацыі гадавы плян збожжазагатовак перавыканаў на 11,6 проц., калгасы Гусьлішчанскага с-с здалі збожжа звыш як у тры разы супроць плянавага заданьня (гадавы плян выкананы на 334,6 проц.), калгасы Сялецкага сельсавету гадавы плян выкалі на 107,8 проц.

Але там, дзе партячэйка і сельсаветы вакол збожжазагатовак не разгарнулі адпаведнай работы, не маблізавалі вакол гэтага пытаньня грамадзкай думкі калгасьнікаў і бядняцка-серадняцкай часткі аднаасобнікаў, збож жазагатоўкі праходзяць зусім марудным тэмпамі.

Так, Навасельскі сельсавет на 23 кастрычніка гадавы плян збожжазагатовак выканаў усяго на 32,2 проц. Такія тэмпы тлумачацца тым, што сельсавет і мясцовая партячэйка не маблізавалі калгасныя і бядняцка-серадняцкія гаспадаркі на фактыўнае збож жазагатовак, на рашучую барацьбу з кулаком. Замест актыўнага правядзеньня збожжазагатоўчай кампаніі асобныя праўленьні калгасаў падпалі пад уплыў кулацкіх, месьніцкіх настрояў, ухіляюцца ад здачы лішкаў збожжа пралетарскай дзяржаве.

Калгас імя Леніна адразу пасьля аб малоту пачаў складаць розныя дутыя фонды. Напрыклад фуражны фонд у гэтым калгасе складзены большы чым трэба. Пасьля гэтага калгас здае некалькі центнэраў збожжа па за гатоўках. Калгас «З рашаючы год пяцігодкі» ня здаў яшчэ ніводнага центнэра збожжа дзяржаве.

Яшчэ горш абстаіць справа з выканьнем пляну збожжазагатовак па некаторых вёсках. Вёскі Ізобішча і Высокае плян збожжазагатовак выканалі ўсяго на 10 проц. Цьвёрдыя заданьні кулацка-заможнымі гаспадаркамі не выконваюцца. Сельсавет ніякіх мер па спагнаньню цьвёрдых заданьняў ня прымае. Некаторыя члены сельсавету патураюць кулаку ў невыкананьні цьвёрдых заданьняў.

Збожжазагатоўкі па Дабрасьневіцкім сельсавеце ганебна зрываюцца. Гэты сельсавет да ўзмацненьня тэмпаў загатовак зусім ня прымае ніякіх мер. Сельсавет прымярэнча адносіцца да кулака ў правядзеньні збожжазагатовак.

Ядоцкія, месьніцкія настроі і разважаньні аб нематчымасьці выкананьня пляну збожжазагатовак ня сустрэлі ад паведнага адпору з боку партячэйкі і гэта спрычыніла яшчэ большаму патыбі леньню прарыву. На 27 кастрычніка плян збожжазагатовак выкананы на 14,5 проц., пры чым калгасы амаль не пачыналі здачы збожжа. Па калгасах і гадавы плян выкананы ўсяго на 3,9 проц. Цьвёрдыя заданьні кулацка-заможнымі гаспадаркамі, тэрмін выканаўня якіх даўно мінуў, выкананы на 50 проц. Некаторыя кулацкія гаспадаркі ня здалі па загатоўках нават ніводнага кілё збожжа. Партячэйка і сельсавет ня здолелі стаць на чале збожжа загатовак і арганізаваць іх па баяводству.

Такое-ж становішча наглядаецца і ў Чарназемаўскім сельсавеце, дзе плян збожжазагатовак па калгасах выкана ны на 26,3 проц., а па аднаасобнаму ны на 26,3 проц., а па аднаасобнаму сэктару 30,9 проц. Калгас «Якаўлева» гэтага сельсавету яшчэ не здаў ніводнага центнэра збожжа. Па калгасным сэктары Пальканіцкага і Пашкаўскага сельсавету пляны збожжазагатовак выконваюцца таксама зусім марудным тэмпамі.

Магілеўскі райснаб з свайго боку таксама не прымае мер да ўзмацненьня ня тэмпаў збожжазагатовак. Паслаўшы ў сельсаветы пляны збожжазагатовак райснаб парашыў, што яго місія скончана і не пацікавіўся ходам выканаўня пляну. Штодзенны кантроль і сталае апэрацыйнае кіраўніцтва ходам кампаніі з боку райснабу адсутнічае. У райснабе нават няма зьвестак аб спагнаньні цьвёрдых заданьняў з кулацка-заможных гаспадарак.

Усё гэта прывяло да яшчэ большага прарыву ў збожжазагатоўках, гада вы плян якіх на 25 кастрычніка па раёне выкананы ўсяго толькі на 39,3 пр. Магілеўскі раён павінен рашуча

### Барацьба за збожжа яшчэ не пастаўлена ў центр увагі лёзьнянскіх партячэек

У большасьці сельсаветаў Лёзьнянскага раёну збожжазагатоўкі праходзяць самацёкам. Па станоўчы на 1-XI раённы плян выкананы ўсяго на 50,5 проц. Па аднаасобным сэктары на сёньняшні дзень здана ўсяго толькі 177,6 тоны, замест 800 тон. Калгасны сэктар увесь час цягнецца ў хвосьце загатовак.

Да гэтага часу калгасы яшчэ ня маюць пляну збожжазагатовак. Райснаб т. Генін кажа, што «калгасы нашага раёну зьяўляюцца лёнаводнымі і лішкі хлеба могуць не здаваць.

Цьвёрдыя заданьні з кулацка-заможнай часткі вёскі спагняюцца зусім слаба. Па ўсём раёне спагнана толькі 139,8 тон па цьвёрдых заданьнях. Сельсаветы ня ведаюць хто і наколькі з кулацка-заможных гаспадарак выканалі свае заданьні. Адсюль, як вынік, няма належнага націску на кулацка-заможныя гаспадаркі.

Усё гэта сьведчыць аб тым, што барацьба за выкананьне пляну хлебазагатовак яшчэ не пастаўлена ў цэнтр увагі значнай часткі партыйных ячэек.

Партячэйкі, сельсаветы недастаткова праяўляюць клясавую пільнасьць. Кулак і яго агентура—апартуністы, вядуць шалёную агітацыю супроць збож жазагатовак, агітуючы калгасьнікаў на тое, што «хлеб дзяржаве насьпеем здаць, раней падзелім паміж сабой». Гэтыя разважаньні не атрымалі належнага адпору з боку партыйных ячэек, сельсаветаў і праўленьняў калгасаў. Партыйныя ячэйкі яшчэ ня сталі на чале барацьбы за хлеб, не разгарнулі масавай работы вакол загатовак, не маблізавалі калгасныя, бядняцкія і серадняцкія масы на хутаранскіх выкананьне пляну. Ёсьць рад чэйшае выкананьне пляну. Ёсьць рад чэйшае выкананьне пляну. Ёсьць рад выпадкаў, калі калгасы штучна зьмяшваюць наяўнасьць хлеба, каб даўсьці немагчымасьць здаваць лішкі дзяржаве. (Калгасы «Варашылава», «518», «Молатава»).

Зусім дрэнна праходзяць збожжазагатоўкі з боку МТС. На 25-X замест 209 тон, загатоўлена ўсяго 27,8 тон. Кіраўніцтва МТС у гэтым напрамку бязьдзейнічае. Замест прыняцьця мер для разгортваньня масавай работы, дырэктар т. Селіванаў паехаў у адпачынак.

Прафсаюзы і камсамольская арганізацыя раёну яшчэ не раскачаліся. Ня створаны ўдарныя брыгады з членаў прафсаюзу і камсамольцаў для дапамогі ў практычнай рабоце сельсаветаў і загатоўчых арганізацый. Адным з галоўнейшых недахопаў у галіне збож жазагатовак зьяўляецца недастатковае разгортваньне сацспаборніцтва і ўдарніцтва паміж калгасамі і асобнымі гаспадаркамі і дварамі. Раённыя арганізацыі павінны ў бліжэйшыя 2-3 дні прымуціць загатоўчыя арганізацыі і сельсаветы наладзіць вучот па здачы збожжа цьвёрдых заданьняў.

Надыходзячы масавы агляд партыйнай работы павінен быць у першую чаргу выкарыстан для таго, каб маблізаваць усю партыйную арганізацыю, увесь савецкі актыў для поўнага выкананьня хлебазагатоўчых пляноў.

**Сямён Вольны.**

### Зьняць пагрозу зрыву пляну збожжазагатовак

**Вушачы.** (Наш кар.). У Вушацкім раёне ў галіне збожжазагатовак ёсьць вялікі прарыў, да 1 лістапада плян выкананы на 35 проц. Загатоўчыя арганізацыі раёну райгандаль, райспажыўсаюз і райкаапсаюз ня маюць сталых зьвестак аб выкананьні пляну. Райспажыўсаюз, лічыць, што на 27 кастрычніка агульна раённы плян выкананы толькі на 10 проц., райгандаль лічыць, што на 35 проц. Хто з іх праўдзіва дагадацца. Наогул у вучоце паўзе поўная неразбярыха, прычым нават і такія зьвесткі атрымліваюцца толькі праз дэкаду. Зразумела што такія зьвесткі ня могуць быць апэрацыйнымі, па іх нельга правільна арыентавацца ў выкананьні пляну.

Асабліва адстае па загатоўках сацыялістычны сэктар—калгасы, якія выканалі плян толькі на 26 проц. Прычыны такога адставаньня хаваюцца у наяўнасьці кулацка-спажывецкіх настрояў у калгасах. Рад старшынь калгасаў, падпаўшых пад уплыў кулака надрэз адмовіліся выконваць пляны збожжазагатовак. **Так, старшыня калгасу «Чырвоная Зьвязда», Завячэльскага сельсавету, заявіў: «Збожжа ня дам, няма». Між тым, згодна падлічэньняў у гэтым калгасе ёсьць шмат лішкаў збожжа, якімі можна перавыканаць плян. Старшыня калгасу «Чырвоны Захад», Кублішкага сельсавету, Барысенка зьменшыў лічбу наяўнага збожжа і адмаўляецца ад загатовак, кажучы: «збожжа няма».**

Больш адгадна зрабілі старшыня калгасу «Чырвоны трохкутнік Усайскага сельсавету,—Жэўжык і рахункавод гэтага калгасу Ліцьвін. Яны збожжа зга дзіліся здаць дзяржаве... але іхняе збожжа пры прыёмцы было гнілое, і, вядома, ня было прынята.

Бязьдзейнасьць партячэек і сельсаветаў скарыстоўваюць кулакі, якія для зрыву хлебазагатовак часта выкарыстоўваюць членаў сельскага савету.

Старшыня камітэту ўзаемадапамогі Глыбачанскага сельсавету В. Ялюга і член сельсавету вёсак Асінаўка і Апгунова сыстэматычна дапамагалі кулакам і замежнікам зрываць сходы па загатоўках збожжа, актыўна выступаючы супроць давядзеньня ўсялякіх пляноў.

Вушацкі райком КП(б)Б за ганебнае адставаньне ў загатоўках ужо атрымаў папярэджаньне ад ЦК КП(б)Б. Райпарт арганізацыя абавязана рашучай барацьбой супроць кулацка-спажывецкіх настрояў, супроць кулакоў і іх агентаў, забясьпечыць поўнае выкананьне пляну збожжазагатовак.

РКК-РСІ павінна прыняць тэрміновыя меры да таго, каб анархія і блытаніна, у зьвестках была тэрмінова зьнішчана.

**Карцель Ільля.**

# Справаздачна-перавыбарчая кампанія ФЗМК

**выкрыла, што ЦП саюзу дзяржгандальслужачых не вяло ніякай работы па разгортваньні сацспаборніцтва і ўдарніцтва сярод членаў саюзу. Менскі гарком прафсаюзу дзяржгандальслужачых, на чале з старшынёй тав. Гутэрманам замест перабудовы прафсаюзнай работы—разваліў яе**

### Даць лепшых рабочых, лепшых ударнікаў у новы склад ФЗМК

## У часе перавыбараў выкрыем усе недахопы

Падрыхтоўка да справаздачна-перавыбарчай кампаніі ФЗМК і распрацоўка адозвы УсеЦСПС шырока ахапіла прадпрыемствы Віцебску.

Гэта работа праходзіць пад лёзунгам ліквідацыі прарываў у выкананьні гаспадарчых заданьняў, сустрэчы 14-й гадавіны Кастрычніка, за поўнае выкананьне прамфінпляну, перабудову ўсёй прафсаюзнай работы.

Добра пастаўлена работа на акуляр най фабрыцы. На зьменава-групавых сходах распрацавана адозва УсеЦСПС і арганізаваны дабраахвотныя брыгады па праверцы работы фабкому. Брыгадамі ахоплена каля 200 чал. Былы зьлёт ударнікаў па прапрацоўцы адозвы УсеЦСПС абвясьціў сябе мабілізаваным на выкананьне сацыялістычнага дагавору з прафсаюзамі Заходняй вобласьці.

На пільным заводзе для правядзеньня перавыбараў ФЗМК вылучана камісія і створана брыгада для праверкі выкананьня дагавораў з Заходняй вобласьцю. Перавыбары ФЗМК на заводзе будуць 24 кастрычніка. На лепшае правядзеньне перавыбараў заключан дагавор з другім пільным заводам.

У зьвязку з разгорнутай работай да перавыбараў ФЗМК на махорачнай фабрыцы і распрацоўкай адозвы УсеЦСПС выяўлена шмат недахопаў. Няма гаспадарча-разрахункавых брыгад, адсутнічае вучот сацспаборніцтва і ўдарніцтва, няма вучоту рабочых прапаноў; ня было ніводнага сходу ўдарнікаў; культурна-выхаваўчая праца таксама кульгае, пра зімовую паліпвучобу рабочая маса ня ведае. Гра мадзкае харчаваньне пастаўлена зусім дрэнна. На фабрыцы няма сваёй сталоўкі. На сходзе 23-га кастрычніка рабочыя адзначылі ўсе недахопы ў рабоце фабкому, якія патрабуюць пай хутчэйшага зьнішчэньня. Новы склад фабкому павінен улічыць гэтыя памылкі.

На голкавай фабрыцы праца па перавыбарах ФЗМК разгорнута шырока. На агульным сходзе прапрацавана адозва УсеЦСПС. 15 рабочых абвясьцілі сябе дабраахвотнікамі па праверцы работы фабкому. Падрыхтоўка да справаздачна-перавыбарчай кампаніі ўвязваецца з перабудовай прафработы на фабрыцы. Будуць створаны чатыры цэхкамітэты, а ў кожным цэху і групе будуць абраны групарганізатары. Рабочыя распрацавалі канкрэтны плян перавыбараў і ўзялі на сябе абавязкі арганізаваць да перавыбарчай кампаніі тры гаспадарча-разрахункавыя брыгады. Высунута пытаньне аб пераводзе 95 проц. усіх рабочых на прагрэсыўна-прэміяльную зьдзельшчыну.

Завод «Чырвоны мэталіст» толькі за апошні час пачаў разгортваць работу. 27-га кастрычніка адбыўся сход прафактыву заводу, дзе прапрацоўвалася адозва УсеЦСПС. Справаздачна-перавыбарчая кампанія праходзіць пад лёзунгам «Выкананьня і перавыкананьня прамфінпляну да 14-й гадавіны Кастрычніцкай рэволюцыі, каб зьняць завод з чорнай дошкі. Забясьпечыць актыўны ўдзел у праверцы і 100 проц. яўку рабочых на справаздачныя і перавыбарчыя сходы, поўны ахоп непісьменных лікпунктамі, ахоп новых рабочых прафсаюзным членствам».

Прафактыў прыняў выклік рабочых фабрыкі «Прафінтэрн» і ўключыўся ў фінэстафэту.

Завод «Чыр

# Вучыцеся ад швэйнікаў БССР замагацца і перамагаць

## Падарунак Кастрычніку

Дзякуючы гераічнай барацьбе на фронце сацыялістычнага будаўніцтва рабочых, гаспадарнікаў, і лепшых спэцыялістаў швэйнай прамысловасьці, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, швэйная прамысловасьць БССР выканала пяцігодку за тры гады.

ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б далі чоткую дырэктыву аб разгортваньні лёгкай індустрыі ў БССР базуючыся на мясцовай і прывазной транспартабельнай сыравіне. Швэйнікі, абапіраючыся на гэтыя дырэктывы вывялі швэйную прамысловасьць БССР з рамесна-саматужных майстэрняў на шлях індустрыяльнай арганізацыі вытворчасьці.

Ад жалязка і нажной машыны, да параэлектрычнага прэсу і аўтамату, ад рамеснай пашыўкі да бесь перапыннага патоку канвэера—вось шлях швэйнікаў БССР.

Учора была апублікавана пастанова ЦВК і СНК БССР, у якой мы чытаем «гэтая перамога, якая зьяўляецца перамогай усяе рабочае клясы БССР, дасягнута пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі і непаранор капітулянцкім прароцтвам правых—«левых» апартуністаў».

Для таго, каб уявіць тую вялізарную перамогу швэйнікаў падамо толькі некалькі лічбаў.

У 1926-27 г. уся прадукцыя швэйнай прамысловасьці БССР склала 3 мільёны 966 тысяч з коль касьцю 500 рабочых. На 4 квартал 1931 г. будзе выпушчана прадукцыі на 70 мільёнаў руб., а за ўвесь 1932 г. прадукцыя будзе складаць 300 мільёнаў руб. Рабочых ў 4-м квартале будзе 19.000, а ў 1932 г.—23.000 чал.

На парозе сьвяткаваньня 14-й гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі швэйнікі БССР уносяць свой чырвоны падарунак—выкананьне пяці годкі за тры гады—за першыя дзьве дэкады 4-га кварталу, якія так сама паказалі высокія тэмпы работы.

Швэйная прамысловасьць уступила ў 4 квартал 3-га рашаючага году пяцігодкі. Прамысловасьць павінна даць гатовай прадукцыі на 70 мільёнаў руб., замест 53 мільёнаў у 3-м квартале.

Фабрыкі Белшвэйаб'яднаньня маюць усе рэальныя ўмовы для выкананьня і перавыкананьня гэтага пляну.

Прыклад швэйнікаў БССР гэта паказьнік таго як пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, як пры няўхільным ажыцьцяўленьні 6 умоў тав. Сталіна, як пры высокіх бальшавіцкіх тэмпах, паказваючы сапраўдна камуністычныя прыклады работы, можна дасягнуць вялізарных перамог на фронце сацыялістычнага будаўніцтва.

## ПЕРАНЯЦЬ ПРЫКЛАД ЗАВОДУ „ПРАЛЕТАРЫ"

Паміж брыгадамі арматурнага цэху заводу «Пралетары» распачалося сацспаборніцтва на лепшае выкананьне прамфінпляну і пярэдзьнства па конкурсу. Сацспаборніцтва праводзіцца пад лёзунгам за лепшае разгортваньне ўдарніцтва. Брыгадзір брыгады токараў імя «Спутнік мопраўца» тав. Цёмкін высунуў прапачову пераняць прыклад луганскіх рабочых і перайсьці на зьменна-сустрэчны прамфінпляк. Думка была падтрымана ўсімі рабочымі брыгады.

У выніку рабочы Гарэлікаў, які па норме павінен зрабіць 130 таловак, даў сустрэчны 20, выканаў 197. Цёмкін з нормы 180 кляпанаў даў сустрэчны 40, а выканаў 270. І такое перавыкананьне дзённых нормаў прыняло масавы характар.

Гэтыя прыклады паказваюць, што зьменна-сустрэчны зьяўляецца лепшым мэтадам сацспаборніцтва і ўдарніцтва і трэба гэту форму пераняць усім заводам Беларусі. (Белта).

## Аршаншчына да 14 гадавіны Кастрычніка

Ворша (наш кар.). Прадпрыемствы і партыйныя, савецкія, прафсаюзныя, камсамольскія і калгасна-кааперацыйныя арганізацыі Аршаншчыны па баявому рыхтуюцца да сьвяткаваньня 14 гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі і рыхтуюць падарункі.

Рабочыя заводу «Чырвоны барацьбіт» уключыліся ў Сталінскую эстафету і ўзялі на сябе абавязак: скончыць да сьвята рамонт 4 трактароў канчаткова ліквідаваць абязьлічку варштатаў і інструментаў, зьменшыць брак у ліцейным цэху да 3 проц., ахапіць партвучобай усіх партыйцаў і камсамольцаў і сабраць і здаць увесь металялом.

Сьлюсарны цэх Копыскага кахельна-плітачнага заводу ў падарунак 14 Кастрычніку ўзяў на сябе абавязак поўнасьцю адрамантаваць і пусьціць у ход 2 варштаты мэханізаванага стандарту-фармсаначны мэханічны варштат, які заменіць увесь трэці паверх заводу і будзе выпрацоўваць столькі прадукцыі, колькі выпрацоўвалі 15 фармаўшчыкоў і пусьціць у ход фальцовачны варштат, які будзе замяняць і аблегчыць працэс адмочваньня гліны. Гэтыя два варштаты зьмогуць сабекошт, уздымуць якасьць прадукцыі і працэсы вытворчасьці.

Камісія па мабілізацыі унутраных рэсурсаў Белдрэсу сабрала і здала ў падарунак 14 Кастрычніку 40 тон жалеза і 25 тон чыгуну.

Па арцелях самапрамсаюзу зараз праводзіцца праверка і перазаключэньне сацмоў, выяўленьне новых ударнікаў і высоўваньне новых сустрэчных пляноў на 4 квартал гэтага году.

Па Стайкаўскім лесазаводзе арганізавана 2 новых гаспадарча-разьліковых брыгады імя 14 кастрычніка. Разгорнут збор рабочых рацыяналізатарскіх прапаноў у фонд 4 заключнага году пяцігодкі.

Аршанскае аддзяленьне Белбудканторы скончыць пабудову трохпавярховага дому на 19 кватэр, Рантгенаўскага кабінэту, два новых драўляных дамы, квасільны пункт у калгасе «Чырвоны Бераг», дзьве двухкамплектовыя школы у в. в. Сьметанкі і Вакары і драўляны двухпавярховы дом пры Якаўлевіцкай фабрыцы.

Сьвінагадоўчы саўгас «Вусьце» у падарунак 14 Кастрычніка рыхтуе скончаньне пабудовы двух сьвінаматачнікаў, ізалятара для сьвіньней і кухні на сьвіннім дварэ. Да сьвята таксама будзе скончана пабудова калодзежа і яго мэханізацыя, будуць ацеплены ўсе сьвінарні, поўнасьцю будуць пераведзены на прагрэсыўна прэм'яльную аплату усе работы ў саўгасе, скончыцца рамонт і дабудова новых жыльлёвых памяшканьняў. За кошт рэсурсаў самога саўгасу мяркуецца палепшыць грамадзкае харчаваньне рабочых. У дзень сьвята адбудзецца ўрачыстае адчыненьне падачы Асінбудам току для электрыфікацыі саўгасу.

Рад сельсаветаў і калгасаў узяў на сябе абавязкі да Кастрычніцкага сьвята скончыць поўнасьцю збожжазагатоўкі і іншыя гаспадарча-палітычныя кампаніі.

Усё гэта праходзіць пры ўдзеле трудавых мас, пры вялікім уздыме творчага энтузіязму гэтых мас новымі посьпехамі ў рабоце на вытворчасьці і ў будаўніцтве адзначыць 14 гадавіну Кастрычніцкай рэвалюцыі.

**А. Кудрын.**

## Скончыў гадавое заданьне

**Мозыр.** (Белта). Калінкавіцкі лесакамбінат 25 кастрычніка скончыў выкананьне свайго гадавога прамфінпляну ў 10500 кубаэтраў. Посьпех барацьбы за прамфінпляк дасягнуты ў выніку творчага энтузіязму рабочых лесакамбінату.

# Апартуністычная ўстаноўка на ўраўнілаўку,

## спажывецка-кулацкія настроі павінны атрымаць рашучы адпор

„Толькі на аснове разьмеркаваньня даходаў па колькасьці і якасьці працы замацоўваецца зьдзельшчына, узьнімаецца прадукцыйнасьць працы, падвышаюцца якасныя паказьнікі калгаснай вытворчасьці" (З адозвы ЦК КП(б)Б

## Разьмеркаваньню ўраджаю—

### штодзённае апэрацыйнае кіраўніцтва

**Правільная арганізацыя працы ў калгасах, зьдзельшчына, ліквідацыя абязьлічкі, правільны і дакладны ўлік работы кожнага калгасьніка, правільнае разьмеркаваньне даходаў зьяўляецца адным з асноўных сродкаў барацьбы за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў.**

**Вось чаму «арганізацыйна-гаспадарчае замацаваньне калгасаў на даным этапе калгаснага будаўніцтва зьяўляецца галоўнай рашаючай задачай, практычнае вырашэньне якой вызначае новыя посьпехі ў сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі» (з адозвы ЦК КП(б)Б).**

**Вакол барацьбы за арганізацыйна-гаспадарчае замацаваньне калгасаў павінна быць сканцэнтравана ўся ўвага. Партарганізацыі і кожны камуніст паасобку павінен паставіць у цэнтр штодзённай сваёй работы гэта важнейшае палітычна - гаспадарчае пытаньне.**

**Правільна арганізаваць работу на аснове новых форм і мэтадаў бальшавіцкай работы, гэта значыць замацаваць і дасягнуць больших посьпехаў у галіне калгаснай вытворчасьці.**

**Увядзеньне зьдзельшчыны, ліквідацыя абязьлічкі даюць магчымасьць правільна разьмеркаваць калгасныя сілы і сродкі вытворчасьці на баявых вучастках работы.**

**Аднак, весткі з месц, гавораць аб тым, што на гэты вучастак работы ў радзе месц ня зьвернута належнай увагі.**

**«Умацаваць калгасы, гэта значыць правільна арганізаваць працу, укараніць зьдзельшчыну ва ўсіх відах работы, наладзіць яе дакладны ўлік, ліквідаваць абязьлічку, вытравіць з калгаснай практыкі дробна-буржуазную ўраўнілаўку»—вось на што павінен быць зроблен напор у штодзённай рабоце партыйных і савецкіх арганізацый. Між тым сыгналы з месц гавораць, што рад партячэек яшчэ не далі належнай увагі арганізацыйна-гаспадарчаму замацаваньню калгасаў.**

**Выдача авансаў па едакох, кулацка спажывецкія настроі — вось што галоўным чынам наглядаецца па калгасах Вушацкага раёну. Наяўнасьць абязьлічкі, адсутнасьць зьдзельшчыны прывялі калгасы Вушаччыны да буйных прарываў.**

**У гэты час партыйныя ячэйкі на мясцох не змаглі мабілізаваць калгасныя масы на барацьбу з кулацкай ураўнілаўкай, спажывецкімі настроямі.**

**Адным з асноўных зьвеньняў, якое садзейнічае арганізацыйна-гаспадарчаму замацаваньню калгасаў зьяўляецца правільнае разьмеркаваньне даходаў. «Разьмеркаваньне даходаў па працадніях, — гаворыцца ў адозьве ЦК КП(б)Б,—асноўнае зьвяно арганізацыйна-гаспадарчага замацаваньня калгасаў, за якое патрэбна зараз узяцца. Толькі на аснове разьмеркаваньня даходаў па колькасьці і якасьці працы замацоўваецца зьдзельшчына, узьнімаецца прадукцыйнасьць працы, падвышаюцца якасныя паказьнікі калгаснай вытворчасьці».**

**Здавалася-б што гэтыя ўказаньні партыі павінны быць пакладзены ў аснову ўсяе барацьбы на фронце калгаснага будаўніцтва. Між тым апошнія весткі Наркамзёму аб ходзе разьмеркаваньня даходаў у калгасах, матар'ялы рабселькораў, сыгналізуюць аб яўнай недаацэнцы ў радзе месц пытаньня разьмеркаваньня даходаў у калгасе.**

**У радзе месц зямельна-калгасныя органы, партыйныя ячэйкі ня кіруюць разьмеркаваньнем даходаў. У выніку гэтага рад калгасаў пад уплывам кулацкай агітацыі яўна скаціліся да кулацкай ўраўнілаўкі, разьмяркоўваючы даходы з грубым парушэньнем працоўнага прынцыпу**

**Пара пакончыць з апартуністычным самацёкам у справе разьмеркаваньня даходаў. Зямельна-калгасныя органы павінны па-бальшавіцку пераключыцца на штодзённае апэрацыйнае кіраўніцтва арганізацыйна-гаспадарчым замацаваньнем калгасаў.**

**Трэба добра памятаць, што разьмеркаваньне даходаў у калгасах зьяўляецца аднэй з адказьнейшых работ, на якую павінны быць накіраваны ўсе сілы партыйных арганізацый. Спробы кулака сарваць разьмеркаваньне даходаў павінны атрымаць рашучы адпор, гэтыя спробы павінны быць разьбіты ўшчэнт.**

## Пераможным шляхам

Жнівень для фабрыкі «Прафінтэрн» быў пераломным. Фабрыка ня выканала прамфінпляну. Нядбайныя адносіны і абязьлічка заядалі фабрыку. План першага паўгодзьдзя быў выкананы толькі на 89 проц.

Абвяшчаецца месячнік штурму. Жнівень дае першую перамогу 104,5 проц. пляну. Але гэтага мала, каб навяртаць прарыў. Мабілізуецца ўся актыўнасьць рабочых фабрыкі. Верасень, дзякуючы спаборніцтву паміж цэхамі і арганізацыі рабкораўскіх пастоў на кожным вучастку замацоўвае посьпехі жнівня і дае 107,5 проц. пляну.

27-га верасьня фабрыка адзначыла буйную перамогу: Паўпалітовы цэх выканаў праграму трэцяга кварталу, а ў пачатку кастрычніка гадовую. **Фабрыка выканала сваю пяцігодку ў тры гады.**

Сустрэча чацьвертага кварталу выклікала новую хвалю энтузіязму. На ўсіх вядучых вучастках ліквідавана абязьлічка, новым прытокам рабочых прапаноў і ўступленьнем лепшых рабочых у рады ўдарнікаў, прафінтэрнаўцы адзначылі свой уваход у чацьверты квартал. За першыя дні кастрычніка паступіла каля 100 прапаноў. Зараз ударнікі на праверцы. 1340 лепшых ударнікаў праверены. Гэта іх воляй, іх энтузіязмам і запалам адзначаюцца перамогі.

Чацьверты квартал стрэлі ва ўсеўзброеньні. Пляны дэталёва абгаворана на ўсіх цэхах, агрэгатах і брыгадах. Белшвэйаб'яднаньню прафінтэрнаўцы далі сустрэчную лічбу прадукцыі. Замест 12 проц. павялічэньня супроць 3-га кварталу, дадзена лічба 25 адзінак на кожную зьмену. Цяпер прафінтэрнаўцы рыхтуюцца да пераходу на 7-мігадзінны рабочы дзень.

Магілеўская швэйная фабрыка не дадае краіне продукцыі. Яна ў паласе глыбокіх прарываў. Фабрыка «Прафінтэрн» кідае туды буксірную брыгаду, якая, прапрацаваўшы 13 дзён, дапамагла фабрыцы ліквідаваць прарыў.

Нельга не адзначыць герояў, якія аддаюць увесь свой запал, энтузіязм і бадзёрасьць на барацьбу за плян, за пяцігодку. Вось яны:

**С. Каган**—дырэктар фабрыкі, рабочы выдучэнец, быў старшынёй фабкому, загадчыкам вытворчасьці. Яго кандыдатура высунута на атрыманьне ордэна Леніна.

**Т. Шадхан**—на фабрыцы 14 год, за рацыяналізатарскія мерапрыемствы некалькі разоў прэм'яваўся. У час пра бываньня ў буксірнай брыгадзе на фабрыцы імя Валадарскага, правёў вялікую работу.

**Т. т. Катышаў, Зігельбаум** прадстаўлены да атрыманьня ордэна Працоўнага сьцягу. Абодва яны маюць вялікі вытворчы стаж. Тав. **Катышаў** адзін з першых і лепшых ударнікаў фабрыкі працуе на ёй з самага заснаваньня, увесь час знаходзіўся на адказных пасадах: майстрам, інструктарам, а зараз пам. загадчыка цэху. Тав. **Зігельбаум** на фабрыцы 11 год. За сваю аддадную работу атрымаў пераходны сьцяг фабкому.

**Т. т. Бор, Марковіч, Пэйсаховіч, Крымневіч, Баярэр, Качурын, Міркіна, Гантман, Давыдан; Парэцкі, Брук, Зак, Габштэйн, Вахава, Ціханенка, Ханін, Ліпкоўскі і інш.**—вось тыя, чыёй энэргіяй і запалам дасягнулі перамог.

**Язэп Чорны.**

## XIV гадавіну сустрэнем электрыфікацыяй сельскай гаспадаркі і прадпрыемстваў гораду

**Дуброўна.** XIV гадавіна Кастрычніцкай рэвалюцыі па Дуброўенскім раёне будзе спаткана дасягненьнем ў галіне электрыфікацыі сельскай гаспадаркі і асьвятленьнем гораду. Да 7 лістапада будзе электрыфікавана фабрыка Дняпроўскай мануфактуры, горад, саўгасы «Станіслава», «Халоўе», Дуброўенская малочная фэрма.

Да 1 студзеня 1932 году будзе электрыфікавана МТС і рад калгасаў Ілянскага, Мардашэвіцкага і Сватыцкага сельсаветаў і рад прадпрыемстваў гораду. (Белта).

## Закончваецца пабудова Гомельскага элеватара

**Гомель** (Белта). Пабудова Гомельскага элеватара падыходзіць да канца. Закончваюцца работы па абсталяваньні. Элеватар будзе адчынены да Кастрычніцкіх сьвят.

## Арганізацыі Бярэзінскага камбінату не стварылі нармальных умоў для работы фабзавучу

**Нова-Барысаў.** Фабзавуч Бярэзінскага камбінату знаходзіцца ў пагражаючым становішчы. Навучальны год зрываецца. Адпушчана памяшканьне для сьлясарнай майстэрні зусім не апаленае, вучні працуюць у вопратцы. Патрэбнага інструманту для практыкаваньня няма. Штодзённыя прагулы вучняў па віне адміністрацыі. У чыгапальнай майстэрні ўстаноўлена 4 машыны, якія ня могуць ахапіць усіх вучняў, а ў цэхах фабрыкі «Пралетарская перамога» машыны стаяць навы карыстанымі.

Фабрычныя арганізацыі не зьвяртаюць належнай увагі на работу фабзавучу, якому патрэбна стварыць умовы для вучобы.

Вінаватыя ў зрыве вучобы павінны адказаць. (Белта).

За „Чырвоную кнігу саветаў"

# Кожная дэпутацкая група-ударная брыгада друку

## Стварэньне „Чырвонай кнігі саветаў" становіцца справай усяго бальшавіцкага друку БССР

**Раённы і заводзкі друк павінны канкрэтным справам уключыцца ў барацьбу за перабудову работы саветаў, узяць пад сталы кантроль арганізацыі, якія ўключыліся ў сацспаборніцтва**

## Конкрэтнымі дзеямі

### „Ленінскі прызыў" адказвае „Камуністу"

**Рэдакцыя «Ленінскі Прызыў» прымае выклік Бабруйскай газэты «Камуніст» аб уключэньні ў сацспаборніцтва ва месца ў «Чырвонай кнізе сацыялістычных рапартоў саветаў» і бярэ на сябе наступныя самаабавязацельствы:**

**1. Мабілізаваць увагу рабселькораў рабочых і працоўных гораду і вёскі на лепшую арганізацыю справаздачнай кампаніі саветаў, на штодзённае і апэрацыйнае асьвятленьне ў друку і насьценгазэтах ходу справаздачнай кампаніі саветаў.**

**2. Стала і сыстэматычна сачыць за ходам выкананьня ўзятых гарсаветам і сельсаветамі нашага раёну на сябе абавязацельстваў, шляхам арганізацыі праверачных брыгад рабселькораў, арганізацыі грамадзкага буксіру перадавымі сельсаветамі адстаючых, перадавымі выбарчымі вучасткамі гарсавету—адстаючых, дапамагаючы праз друк ажыцьцяўленьню ўзятых саветамі абавязацельстваў.**

**3. Для дапамогі ў правядзеньні справаздачнай кампаніі саветаў арганізаваць у 2-х пунктах выпуск спэцыяльных штодзённак «За работу саветаў па новаму» і стварыць выязную рэдакцыю ў адным з буйных пунктаў раёну, арганізаваўшы перадачу вопыту работы справаздачнай кампаніі перадавых сельсаветаў—усім сельсаветам раёну.**

**4. Ператварыць дэпутацкія групы гарсавету ва ўдарныя брыгады друку ўцягваючы ўсіх дэпутатаў гарсаветаў у сацспаборніцтва і ўдарніцтва па выкананьні імі свайго прамфінпляну, ажыцьцяўляючы лёзунг «Кожны дэпутат гарсавету—ўдарнік і рабкор».**

## Рэдакцыі газэты „Савецкая Беларусь" („МАЛАНКА")

*Пленум* **Магілеў кага** *гарсавету прымае выклік* **Бабруйскага** *гарсавету і ўключаецца ў сацыялістычнае спаборніцтва за месца ў* **„Чырвонай кнізе сацыялістычных рапартоў саветаў".**

**Прэзыдыум пленуму.**

## Выклік Бабруйскага гарсавету прыняты Аршанскі гарсавет уключыўся ў барацьбу за месца ў „Чырвонай кнізе"

Прэзыдыум **Аршанскага** гарсавету, абгаварыўшы выклік Бабруйскага гарсавету на сацспаборніцтва на лепшую перабудову работы саветаў, за месца ў **«Чырвонай кнізе сацыялістычных рапартоў», прыняў выклік Бабруйскага гарсавету.**

Уключаючыся на барацьбу за месца ў **Чырвонай кнізе сацыялістычных рапартоў, Аршанскі** гарсавет бярэ на сябе наступныя абавязацельствы.

1.

За час справаздачнай кампаніі гарсавету мабілізаваць увесь савецкі актыў і ўсё працоўнае насельніцтва на пасьпяховае выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну IV кварталу і ажыцьцяўленьне 6 гістарычных паказаньняў т. Сталіна.

2.

Уцягнуць у работу сэкцый гарсавету ўсіх ударнікаў і ўдарніц прадпрыемстваў гораду, **давесьці колькасьць добраахвотнікаў** работы ў сэкцыях гарсавету ня менш 300 **чалавек; адначасова** ўцягнуць у работу сэкцый інжынэрна-тэхнічны персанал гораду, дакторaў і настаўнікаў.

3.

Наладзіць штодзённае кіраўніцтва дэпутацкімі групамі на прадпрыемствах, уцягнуўшы ў іх работу ўвесь савецкі актыў і лепшых ударнікаў прадпрыемстваў.

4.

Прэзыдыум бярэ на сябе абавязак арганізаваць вайсковую сэкцыю пры Гарсавеце, стварыць вайсковыя гурткі на ўсіх прадпрыемствах, поўнасьцю ліквідаваць хямчную няпісьменнасьць сярод працоўнага насельніцтва, узмацніць работу райсавету Асоавіяхіму. Да сьвяткаваньня XIV гадавіны Кастрычніка рэвалюцыі пракладзець сьпісы сем'яў чырвонаармейцаў, аказаўшы ім максымальную дапамогу. Уцягнуць у работу вайсковай сэкцыі ўсіх былых чырвонагвардзейцаў і партызан гораду, забясьпечыўшы выкананьне пастановы аб прадстаўленьні ім льгот.

Палепшыць «культурна - бытавыя умовы пасьлядку гарнізону, дабіцца адчыненьня да 1-га кастрычніка 1932 году «Дому абароны».

5.

Скончыць у тэтым годзе вызначаныя паводле пляну аб'екты камунальнага і жыльлёвага будаўніцтва (**лазьню, пральню, заразьлівы корпус, пажарнае дэпо, 48 і 20 кват, дому, 2-гі паверх над дамамі па Ленінскай вул.), працуючы базавымі тэмпамі і ў зімовы час;** распачаць работу па падрыхтоўцы да будаўнічага сэзону 1932 г.

6.

Прымаючы пад увагу вялікае гаспадарчае значэньне Аршанскага чыгуначнага вузла і шпарк рост прамысловасьці на тэрыторыі гораду, **арганізаваць пры гарсавеце транспартную і прамысловую сэкцыі, забясьпечыўшы** іх работу належным кіраўніцтвам з боку прэзыдыуму.

7.

Надаючы вялікае значэньне новым формам работы савецкага апарату, палепшаньню абслугоўваньня насельніцтва,—паявяляючы колькасьць сацсумяшчальнікаў, стварыўшы ім адпаведныя ўмовы для работы.

8.

У мэтах сапраўднага ажыцьцяўленьня ленінскай нацпалітыкі, і забесьпячэньня абслугоўваньня нацменшасьцяй на іх роднай мове прэзыдыум бярэ на сябе абавязак **поўнасьцю правесьці ў жыцьцё пастановы нацкамісіі ЦВК аб становішчы нацработы ў Аршанскім раёне і пастанову пленуму РК КП(б)Б.**

9.

Для ўзмацненьня і дапамогі сельсаветам раёну ў пасьпяховым вырашэньні ўсіх гаспадарча-палітычных кампаній на вёсцы, у арганізацыйна-гаспадарчым замацаваньні калгасаў, збожжазагатовак і інш., **арганізаваць пры Гарсавеце сэкцыю па рабоце на вёсцы, забясьпечыўшы яе адпаведным кіраўніцтвам.**

10.

Для пасьпяховага правядзеньня ў жыцьцё пастановы СНК аб палепшаньні санітарнага становішча гораду, **прымацаваць да кожнай сталоўкі, пральні хлебазаводу, магазынаў, брыгады членаў гарсавету і сэкцыі.**

11.

У мэтах выкананьня пастановы ўраду аб палепшаньні становішча настаўнікаў і ІТР, не пазьней 1-га сьнежня **адчыніць закрытую сталоўку** для выключнага абслугоўваньня настаўнікаў і ІТР гораду.

12.

Праз дэпутацкія групы гарсавету палепшыць нізавы друк прадпрыемстваў забясьпечыўшы ўдзел усіх членаў гарсавету ў цэхавых штодзённках **«за работу па новаму»** і ў раённай газэце **«Ленінскі Прызыў».**

13.

Прэзыдыум Гарсавету абавязваецца арганізаваць праз дэпутатаў **сыстэматычную праверку выкананьня пастаноў прэзыдыуму і сэкцый** як самім гарсаветам так і ўсімі прадпрыемствамі гораду.

14.

У мэтах забесьпячэньня ўдзелу ў рабоце гарсавету ўсіх членаў гарсавету і дэпутацкіх груп дабіцца таго, каб пры заслухоўваньні дакладаў на прэзыдыумах, альбо пленумах, абавязкова былі суддаклады адпаведных сэкцый і дэпутацкіх груп. Праводзіць адкрытыя паседжаньні прэзыдыуму на больш буйных прадпрыемствах.

15.

Арганізаваць арганізаваную сэкцыю і інстытут пазаштатных інструктароў, да канца справаздачнай кампаніі, наладзіць дасканалы ўлік усіх дэпутатаў і выкананай імі работы.

16.

Арганізаваць сыстэматычную справаздачнасьць дэпутатаў перад выбарчыкамі.

17.

Для абмену вопытам у рабоце гарсавету і праверкі выкананьня самаабавязацельстваў не пазьней 20-га сту дзеня 1932 г. камандіраваць у гор. Бабруйск брыгаду з 4-х чалавек.

18.

Арбітрамі сацспаборніцтва і ўдарніцтва і выкананьне ўзятых самаабавязацельстваў прэзыдыум гарсавету вылучае рэдакцыі газэт **«Савецкая Беларусь», «Ленінскі Прызыў» і «Камуніст»** (Бабруйск).

За перабудову кіраўніцтва раёнамі

# РАЕН—ВУЗЛАВЫ ПУНКТ РАБОТЫ

## Справа палепшаньня кіраўніцтва раёнамі—справа вялікай палітычнай важнасьці

**Шырока разгарнуць праверку апаратаў наркаматаў і цэнтральных установаў у справе кіраўніцтва раёнамі, мабілізаваць вакол гэтай работы грамадзкую думку рабочых, калгаснікаў, шэфаў і работнікаў установаў**

## ВЫШЭЙ ТЭМПЫ, БОЛЬШ АКТЫЎНАСЬЦІ

## Прыклад Наркамзему скарыстаць усім установам

Работа на праверцы апаратаў наркаматаў і цэнтральных установаў у галіне кіраўніцтва раёнамі пачынае разгортвацца. Па многіх наркаматах і цэнтральных установах ужо складзены брыгады, якія прыступілі да практычнай работы.

Прыклад сапраўдных тэмпаў паказвае **Наркамзем.** На 1 лістапада складзены 4 брыгады па 4-5 асоб у кожнай і кіруючы штаб з представнікоў усіх трох бакоў трыкутніка пры ўдзеле брыгадзіра брыгады ЦВК, **ЦКК КП(б)Б і «Савецкай Беларусі».**

2 лістапада брыгады пачалі работу. У гэты-ж дзень праведзена інструкцыйная нарада ўсіх брыгад і пачуўся прыём актыву наркамату для дапамогі брыгадам.

Абвешчана **«Сталінская эстафэта прапаноў».** За першыя 2 дні ў штаб **паступіла больш 20 заяў** аб недахопах у структуры Наркамзему з канкрэтнымі прапановамі аб палепшаньні апарату.

Штаб і брыгады з першага дня завялі спэцыяльныя сшыткі і прапраца валі лісты-пытальнікі для кожнага працаўніка. Штаб імкнецца ня толькі разгарнуць работу, але і наладзіць **добры вучот яе.**

Брыгады кожны дзень рапартуюць аб зробленай рабоце штабу і атрымліваюць патрэбныя тлумачэньні. Праз дзень арганізуюцца лятучыя нарады ўсіх брыгад.

Праз 3—4 дні штаб намеціў склікаць агульны сход прапаўнікоў па пытаньні палепшаньня апарату і зараз ужо ідзе падрыхтоўка мас прапаўнікоў да гэтага сходу.

Трэба адзначыць, што па НКЗ работа разгортваецца лепш чым дзе.

Такое становішча тлумачыцца добрым і актыўным кіраўніцтвам работай з боку партыйнага калектыву установы і актыўным удзелам калегі Наркамзему. З боку калегіі вылучаны ў склад штабу адказны работнік—член калегіі, які прымае самы актыўны ўдзел ва ўсёй рабоце.

**НКЗ выклікае** на сацспаборніцтва па правядзеньні праверкі — **Дзяржпляк.**

Адказу на выклік НКЗ чакае на старонках «Савецкай Беларусі» ў самым хуткім часе.

**М. Хаванскі.**

## Наркамфін пачаў праверку работы апарату

У **Наркамфіне** 2 лістапада складзена праверачная брыгада з 5 асоб. Брыгадзе даручана правесьці работу да 12 лістапада. Укладзена пэрсанальная адказнасьць на кожнага загадчыка сэктару па выяўленьні ўсіх дадатных і адмоўных бакоў у рабоце сэктару і далейшых мерапрыемствах і ў кожным сэктары вылучаны групы т. г. для праверкі работы.

Брыгадзе загадана скарыстаць для выяўленьня адмоўных і дадатных бакоў кіраўніцтва ўсіх выяжджаючых на раёны прадстаўнікоў НКФ і прыяжджаючых прадстаўнікоў з райфэ.

Перад брыгадай пастаўлена пытань не аб шырокім скарыстаньні для работы актыўнасьці мас і прыцягненьні ўсіх грамадзкіх арганізацый да ўдзелу ў агляндзе апарату НКФ, асабліва шэф брыгады, сацнамесьнікаў, рабкораў, сьцянкораў і інш.

Работа будзе праведзена з посьпехам толькі тады, калі кожны партыец і кожны член саюзу прыме актыўны ўдзел у дапамозе брыгадзе.

Ва ўсёй гэтай справе асаблівую ролю адыграе **Райфа** кожнага раёну, бо ім на мясцох лепш відаць асобныя недахопы кіраўніцтва НКФ. Таму ўсе Райфа павінны напісаць брыгадзе НКФ да 12 лістапада свае заўвагі аб недахопах у кіраўніцтве апарату НКФ і прапановы для палепшаньня работы.

Усе райфа, рабкоры, фінкоры і селькоры павінны усе моманты недахопаў кіраўніцтва апарату НКФ шырока асьвятляць у друку, памятаючы, што свайм удзелам у зьнішчэньні недахопаў у кіраўніцтве апарату НКФ кожны рабселькор, актывіст дапаможа ў будучым мець больш посьпехаў у будаўніцтве сацыялізму і наступленьні на капіталістычныя элементы.

Брыгадзір ЦВК і ЦКК і «Сав. Бел.»

**Дзямешчанка.**

## Вушачы не пачулі сыгналаў друку

### Патрабуем неадкладна выправіць сыгналеньн

Вушачы (наш. кар.). Папярэдняе разьмеркаваньне ўраджаю па калгасах Вушаччыны паказала, што цэлы рад калгасаў раёну пры разьмеркаваньні ўраджаю становіцца на шлях кулацкай ўраўнілаўкі. Пры разьмеркаваньні дапушчаны грубыя скрыўленьні прынцыпу «хто больш і лепш працаваў, той больш і атрымлівае».

Так, калгасы «Герой», «Першамайскі гарадок» сена разьмяркоўвалі па гаспадарках, ня ўлічваючы колькасьці і якасьці работы калгасьніка. Калгасы «Маяк» і «Пагранічнік» бульбу разьмяркоўвалі бароснамі па гаспадарках і едакох. Кулацкі прынцып «ураўнілаўка» знашоў сабе месца ня толькі ў паказаных калгасах. Можна прывесьці цэлы рад калгасаў, дзе ўраўнілаўка бралася за аснову.

Знайшоў сабе шырокае месца і другі кулацкі прынцып разьмеркаваньня вызначэньне пайкоў. У калгасе «Бязбожнік», Чарапоўшчынскага сельсавету, «Новае жыцьцё», М-Далецкага сельсавету, «Новае Бутава», Мосырскага сельсавету, прауленьні ўстанавілі штомесячныя пайкі як для працаздольных, так і для непрацаздольных.

У многіх калгасах недапушчальна заблытаны вучот працы. Працадні не запісаны за 2 і нават 3 месяцы. Напрыклад, у калгасе «Чырвоная зьвязда», Чарапоўшчынскага сельсавету, працадні ня ўнесены ў працоўныя кніжкі яшчэ за жнівень. Член праўленьня Даніленак у сувязі з гэтым рашэ разьмеркаваць ураджай па рабочых руках бо ўсё роўна вучоту няма. У калгасе «Чырвоны трохкутнік», Усайскага сельсавету, яшчэ горшае становішча. Працадні многім калгасьнікам не запісаны. Стварэньню такога становішча спрыяе сам старшыня калгасу Жэўжык. Сабе ён за адзін дзень запісвае два з паловай, у той час як старшыні калгасаў павінны атрымліваць ня болей лепшых ударнікаў калгасу.

Недапушчальна тое, што ў многіх калгасах ня выжыты шкодныя кулацкія спажывецкія тэндэнцыі. Пры разьмеркаваньні ўраджаю ўжываецца прынцып: «уперад сабе, а потым—што застанецца—дзяржаве». Бяручы ў аснову гэты кулацкі прынцып, шмат якія калгасы паддаўшыся кулацкаму уплыву, адмовіліся выконваць пляны здачы бульбы, збожжа і іншых культур дзяржаве. Так, напрыклад, калгас «Ударнік», В-Далецкага сельсавету, зусім адмовіўся ад выкананьня пляну збожжазагатовак і іншых культур, калгас «Пагранічнік» гэтага-ж сельсавету вызначыў прадаць дзяржаве збожжа толькі трэцюю частку вызначанага пляну. Калгас «Свабода» замест 170 цэнтнераў здаў дзяржаве толькі 85 цэнтнераў. Калгасы «Праўда» і «Чырвоная ніва» для таго, каб ня здаць дзяржаве збожжа захавалі ўраджай. Старшыня калгасу «Леніна» Сарочынскага сельсавету, на нарадзе актыву адкрыта заявіў «ні на грош збожжа дзяржаве ня дам».

Да правадніцкоў кулацкіх спажывецкіх тэндэнцый павінны быць прыняты самыя суровыя меры, як да зрыўшчыкаў збожжазагатовак.

Трэба канстатаваць, што вялікаю прычынай няправільнага разьмеркаваньня зьяўляецца тое, што інструктаньне працуючых па разьмеркаваньні ўраджаю пастаўлена зусім дрэнна. МТС і райкалгасаюз гэтаму пытаньню аддаюць зусім мала ўвагі. Інструктаваньне давалася паярхоўнае.

Напрыклад, інструктар райкалгасаюзу т. Гіндзін замест дэталёвага тлумачэньня па разьмеркаваньні ўраджаю у Жарскім сельсавеце зрабіў толькі гутарку аб важнасьці разьмеркаваньня. Пасьля яго «інструктажу» пры разьмеркаваньні ўраджаю ў калгасах дапусьцілі памылкі як тэхнічнага, так і палітычнага парадку. МТС і райкалгасаюз два разы ў Плінскім сельсавеце склікалі нарады актыву па пытаньні разьмеркаваньня ўраджаю, два разы, пакідаючы работу ў школах, клюбе, калгасах, актыў зьяўляўся на нарады, а вызначаныя дакладчыкі з МТС і райкалгасаюзу ні разу не зьявіліся. Нарады такім чынам зрываліся. Гэта прыклады адносін раённых арганізацый да разьмеркаваньня ўраджаю.

Дапушчаныя памылкі павінны быць неадкладна выпраўлены. Трэба да

# Усесаюзны конкурс нізавых газэт саўгасаў, калгасаў і МТС

## Селькоры! Станьце перадавікамі арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў

## Задачы і парадак правядзеньня конкурсу

Усесаюзны конкурс нізавых газэт (насьценных, палявых, шматтыражак) у калгасах, саўгасах і МТС на лепшую работу па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў.

### Задачы конкурсу

а) Арганізоўваць масы на замацаваньне ўсіх атрыманых дасягненьняў і вопыту ў справе правядзеньня рашэньняў партыі і савецкай улады (чэрвеньскага пленуму ЦК УсеКП(б), VI зьезду саветаў) аб зьдзельшчыне, аб арганізацыі правільнага вучоту работы кожнага калгасьніка па колькасьці і якасьці працадзён, аб разьмеркаваньні даходаў па колькасьці і якасьці выпрацаваных працадзён.

Весьці рашучую барацьбу з правапартыстычнымі, кулацкімі імкненьнямі зьнізіць нормы выпрацоўкі, перакідваць разьбіўшую сустрэчных норм, сарваць зьдзельшчыну і чоткую арганізацыю працы і г. д.

Таксама бязьлітасна выкрываць новыя манэўры кулака і агентуры кулацтва—апартуністаў, прапагандуючых і праводзячых дробнабуржуазную, «ляўацкую» ўраўнілаўку ў разьмеркаваньні даходаў, у выдачы натуральных авансаў, у прэміраваньні і г. д.

б) Дабіцца зьнішчэньня ўсіх недахопаў у арганізацыі працы калгасьнікаў, замацаваць зьдзельшчыну (брыгадную і індывідуальную), ліквідаваць абязьлічку ў працы, дапамагчы правільна расставіць сілы па вучастках, брыгадах і інш. Бязьлітасна выкрываць кулацкую прапаганду абязьлічкі як спробу дэзарганізаваць вытворчасьць у калгасах. Стаць пад кіраўніцтвам партыі арганізатарам сацыябарніцтва і ўдарництва, сустрэчных плянаў, робячы нізавыя газэты баявымі арганізатарамі сацыялістычных форм працы.

в) У астаўшыяся тэрміны ў адпавед насьці з мясцовымі ўмовамі прыняць усе меры да поўнага выкананьня плану абожжазагатовак, а таксама хутчэйшага выкананьня плянаў загатовак тэхнічных культур, арганізуючы чырвоных абозаў, вывазку хлеба з глыбінных пунктаў і г. д. Арганізаваць селькораў на поўнае выкананьне плянаў загатовак у аднаасобным сэктары, на барацьбу з утойваньнем збожжа кулакамі і кулацкімі агентамі.

Павесьці рашучую барацьбу з правымі дробнабуржуазнай стыхіяй, з кулацкімі спакушэньнямі і тэндэнцыямі ў паасобных калгасах, з буржуазнымі тэндэнцыямі паасобных кіраўнікоў калгасаў і саўгасаў у адносінах да пралетарскай дыяржавы (стварэньне кармовых, страхавых і інш. фондаў коштам збожжазагатовак, коштам зэкватара вагага збожжа і г. д.).

д) Шырока папулярызаваць дырэктывы партыі і ўраду аб адыходніцтве, максымальна спрыяючы выкананьню плянаў адыходніцтва, вылучаючы кадры адыходнікаў, растлумачваючы масам усё значэньне новых форм забесьпячэньня сацыялістычнай прамысловасьці рабочай сілай. Змагацца за максымальнае ўшчыльненьне рабочага дня ў калгасах, за рацыяналізацыю працы, тым самым дамагаючыся выдзяленьня дадзіняй рабочай сілы ў прамысловасьць і ў саўгасы.

е) Прымаць актыўны ўдзел у складаньні новых с.-г. плянаў па 1932 г., імкнуцца да таго, каб уся маса калгасьнікаў прыняла максымальную ініцыятыву ў барацьбе за высокі ўраджай, за сеазавароот, у барацьбе з зазухай, на аснове аўтаданьня агратэхнікай.

ж) Садзейнічаць партарганізацыям у разгортваньні марксысцка-ленінскай вучобы сярод мас калгасьнікаў, рабочых саўгасаў і МТС, дамагаючыся та го, каб аўладаньне імі марксысцка-ленінскім сьветапоглядам спалучалася з усёй іх штодзённай практыкай па рэалізацыям, праўленьням калгасаў і сельсаветам арганізацыйна і гаспадарча. Умацаваць калгас. Пры гэтым улічваецца—якія кампаніі правяла газэта, якія пытаньні ўзьняла, якія вынікі дасягнуты;

б) найбольш часта выпускаліся, пры цягнулі найбольшую колькасьць калгасьнікаў у рады селькораў, ахапілі брыгадамі друку і «рэйдамі» максымальную колькасьць калгасьнікаў;

в) разгарнулі новыя формы масавай работы (брыгады друку, буксіры, рацыяналізатарскія рамункі, паходы за тэхніку і г. д.), дамагліся максымальнай дзейсьнасьці допісаў калгасьнікаў, прасунулі ў масы калгасьнікаў органы друку.

### Парадак прэм'яваньня лепшых

Цэнтральная конкурсная камісія вылучае 20 шматтыражных калгасных газэт, 20 шматтыражных і 15 насьцейных саўгасных газэт, 15 газэт МТС, 60 аўпульнакалгасных і брыгадных насьценных газэт, 15 нізавых канцэрацыйных газэт і 15 фабрычна-заводзкіх (за лепшую перадачу вопыту) на ўсесаюзнае першынство, з узнагародай іх прэміямі 1-га, 2-га і 3-га разрадаў.

**Першыя прэміі:**

а) чырвоныя сьцягі: імя «Правды», і на калёнах: «Крест. газэты», «Соц. зем леделия», «С.-х. рабочего», «СКТ», «Ком. правды», «Гудка», «Рабочей газеты», рэспубліканскіх і краявых газэт.

б) Абсталяваньне паходнай друкарні, апараты-множнікі і абсталяваньне для радыёгазэты.

в) Абсталяваньне бібліятэкі для рэдкалегій і рабселькораў (творы Леніна і Сталіна, рабселькоравскія часопісы і кнігі, творы па газэтазнаўстве, навінкі пралетарскай літаратуры і г. д.).

г) Прадстаўленьне да ўзнагароды па лініі вышэйшых савецкіх органаў.

д) Паездкі на буйнейшыя будаўніцтвы Савецкага саюзу.

Другія прэміі—зазначаныя ў п. п. а, в і г.

Трэці прэміі—зазначаныя ў п. в.

Выдзяляецца 15 узорных раённых газэт з узнагародай іх ў парадку, паказаным вышэй.

Вопыт прэм'яваных газэт абагульваецца ў «Чырвонай нізе» калгаснасаўгаснага друку

Конкурс працягнецца з 1 лістапада па 1 лютага 1932 г.

Па сканчэньні конкурсу пры «Правде» склікаецца рад нарадаў рэдактараў калгасна-саўгасных газэт для абагульваньня вопыту конкурсу і прыстасаваньня яго да веснавой пасеўнай кампаніі 1932 году.

### Парадак правядзеньня конкурсу

У конкурсе павінны ўдзельнічаць:

усе нізавыя газэты калгасаў, саўгасаў і МТС.

Гэтыя газэты арганізуюць конкурс непасрэдна ў сваіх калгасах, саўгасах і МТС.

Для разгортваньня конкурсаў нізавыя газэты (насьценныя і шматтыражкі):

а) дагаварыўшыся з партячэйкай, сельсаветам, праўленьнем калгасу і гл. шырока паведамляюць масы калгасьнікаў аб конкурсе «Правды» і яго задачах (праз старонкі газэт, плякаты, абвесткі, даклады, гутаркі і г. д.), а таксама аб тым, як яны самі будуць праводзіць конкурс у самім калгасе (саўгасе, МТС).

б) Арганізуюць «рэйды» па паасобных пытаньнях выстаўленых конкурсам, прыцягваюць да ўдзелу ў рэйдах масы калгасьнікаў (брыгады друку), выпускі і вывады ўдзельнікаў рэйдаў ставяць на абгаварэньне сходаў калгасьнікаў, праўленьняў калгасаў, вытворчых нарад і г. д., друкуюць матэрыялы рэйдаў і вывады ў газэтах, адзначаюць у іх перадавых ударнікаў-калгасьнікаў, апісваюць лепшы вытворчы вопыт, арганізуюць буксіры для адстаючых вучасткаў, праводзяць конкурсы паміж паасобнымі брыгадамі, разьвіваюць розныя іншыя формы арг масавай работы (агляды, пераклічкі, зборы прапаноў, рацыяналізатарскія рахункі, паходы і г. д.).

Да ўсёй гэтай работы прыцягваюць калгасьнікаў, тлумачачы ім ролю селькораў як актыўных дапаможнікаў партыі, дапамагаючы ім пісаць у газэту, зазначаючы ім на памылкі і г. д.

в) Дамагаюцца пачаткавага выхаду насьценных газэт, стваряюць іх па брыгадах і вучастках, уцягваюць у работу рэдкалегій ударнікаў, агратэхнічных работнікаў, брыгадзіраў і г. д.

Цэнтральныя газэты («Крестьянская газета», «Соц. земледелие», «Сел. хоз. рабочий», «СКТ» і інш) кіруюць конкурсам па раёнах і калёнах.

Іх задачы:

а) па ходзе конкурсу высоўваць канкрэтныя паказьнікі, за якія неабходна ў даны момант змагацца адпаведнай калёне нізавога друку;

б) высылаць брыгады ў дапамогу раённаму і нізавому друку па правядзеньні конкурсу;

в) у аглядах друку асьвятляць і крытыкаваць ход конкурсу;

г) перыядычна ўлічваць вынікі кожнаго куроку, адзначаючы тых, хто адзе напередадзе і адстае па конкурсу.

Рэспубліканскія, краявыя і вобласныя газэты арганізуюць конкурсы ў межах рэспублік, вобласьцяй і раёнаў, разьмяркоўваючы паміж сабой работу па адпаведных галінах і раёнах.

Іх задачы:

а) сачыць за ходам конкурсу ў раёнах шляхам агляду раённых і нізавых газэт шляхам высылкі на месцы брыгад, скліканьня нарад па паасобных галінах і раёнах і г. д.;

б) інструктаваць нізавыя газэты, сыстэматычна асьвятляючы пытаньні, узьнікаючыя ў ходзе конкурсу і паказваючы ўзоры работы, арганізуючы спаборніцтва паміж імі;

в) склікаць раённыя і куставыя зьлёты рабселькораў.

* * *

Пры «Правде» стварэецца цэнтральная конкурсная камісія ў складзе прадстаўніцкай культпрофу ЦК УсеКП(б), «Правды», цэнтральных газэт, ТАСС, Наркамзему, Калгасцэнтру, Зарнятрэсту, Трактарацэнтру і інш. Камісія будзе кіраваць ходам конкурсу.

Гэткія-ж конкурсныя камісіі павінны стварацца пры рэспубліканскіх, вобласных (краявых) і раённых газэтах. Непасрэдна-ж у калгасах, саўгасах, МТС конкурс вядуць рэдкалегіі нізавых газэт пад кіраўніцтвам мясцовых партарганізацый, пры ўдзеле праўленьняў калгасаў і сельсаветаў.

На працягу ўсяго ходу конкурсу конкурсныя камісіі як у цэнтры, так і на мясцох:

адзначаюць перадавы вопыт барацьбы нізавых газэт за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў на старонках газэт, у спэцыяльных бюлетэнях, дошках конкурсу, апэрацыйных зводках і г. д.;

арганізуюць перадачу станоўчага вопыту праз спэцыяльныя зьлёты, нарады, абмены дэлегацыямі і інш.;

улічваюць перадавікоў конкурсу—селькораў-ударнікаў, іх выпорчыя дасягненьні, вылучаюць іх для падахвочваньня з агульнага фонду прэм'яваньня лепшых ударнікаў

### Умовы для вылучэньня на першынства (усесаюзнае, вобласнае, раённае).

Лепшымі нізавымі газэтамі могуць лічыцца тыя, якія:

а) на справе дапамагалі партарганізацыям, праўленьням калгасаў і сельсаветам арганізацыйна і гаспадарча ўмацаваць калгас. Пры гэтым улічваецца—якія кампаніі правяла газэта, якія пытаньні ўзьняла, якія вынікі дасягнуты;

б) найбольш часта выпускаліся, пры цягнулі найбольшую колькасьць калгасьнікаў у рады селькораў, ахапілі брыгадамі друку і «рэйдамі» максымальную колькасьць калгасьнікаў;

в) разгарнулі новыя формы масавай работы (брыгады друку, буксіры, рацыяналізатарскія рамункі, паходы за тэхніку і г. д.), дамагліся максымальнай дзейсьнасьці допісаў калгасьнікаў, прасунулі ў масы калгасьнікаў органы друку.

### Хто наступны?

(Па тэлефоне ад нашага карэспан дэнта).

Бабруйскі раён уключыўся ва ўсесаюзны конкурс, абвешчаны ЦО партыі «Правдай», па арганізацыйна-гаспадарчым замацаваньні калгасаў. Бюро райкому партыі ў сваёй пастанове прапанавала партячэйкам зараз-жа ўключыцца ў конкурс, вылучыўшы 10 чалавек з партыйна-савецкага актыву для пасылкі на вёску па правядзеньні конкурсу.

Для прэм'яваньня лепшых насьценгазэт, калгасамі і саўгасамі вызначана 300 руб.

Рэдакцыя газэты «Камуніст» мабілізавала на вёску большасьць работнікаў для практычнай работы па арганізацыі конкурсу ў саўгасах і калгасах.

Дамброўскі.

## „Гэрой працы" дае добры прыклад

**Калгас «Гэрой працы», Юравіцкага сельсавету, Полацкага раёну, зьяўляецца адным з перадавых калгасаў ва ўсіх адносінах.**

**Выконваючы і перавыконваючы заданьні па сяўбе, уборцы і загатоўках калгасьнікі «Гэроя працы» першымі падхапілі пастанову раённага штабу па арганізацыі штурму ліквідацыі бездарожжа ў аднаму XIV гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі, яны на агульным сходзе 13 кастрычніка вынесьлі пастанову ўключыцца ў гэты штурм і для гэтай мэты да дню Кастрычніжавай рэвалюцыі правесьці тры суботнікі.**

**Калгас «Гэрой працы» заклікае ўсе калгасы Полацкага раёну на ўключэньне ў штурм ліквідацыі бездарожжа.**

**Мы чакаем адказу ад калгасаў Полаччыны.**

**Ч. П.**

# Новая сыстэма крэдытаваньня—

## шлях да ўкараненьня бальшавіцкага гаспадарчага разьліку

**Новы парадак крэдытаваньня ўведзены з 1 лістапада, але ня ўсе гаспадарчыя установы і арганізацыі як сьлед да яго падрыхтаваны**

**Зьнішчыць усе перашкоды на шляху ўвядзеньня новай сыстэмы крэдытаваньня**

### На Аршаншчыне да пераходу на мэтавае крэдытаваньне не гатовы

ВОРША. (Наш кар.). Новыя мэтады фінансавай работы паводле дырэктыў партыі і ўраду—мэтавае крэдытаваньне яшчэ не знайшлі ўвайго практычнага праяўленьня на Аршаншчыне. Наогул трэба сказаць, што выкананьне гэтай важнейшай дырэктывы тут яшчэ не забясьпечана і няма бальшавіцкіх тэмпаў у штодзённай рабоце прадпрыемстваў і арганізацый.

Гэта тлумачыцца тым, што кіраўнікі большасьці устаноў, прадпрыемстваў і арганізацый нават ня цікавяцца становішчам фінансавых спраў і лічаць, што гэта датычыцца толькі іх бухгальтэраў і што калі работа іх прадпрыемства будзе стаяць пад пагрозай зрыву то, ім банк усё роўна будзе дамагаць і даваць сродкі.

Дрэнна справа і са справядлівасьцю. У гэтай галіне таксама не выконваюцца дырэктывы партыі і ўраду.

Мясакамбінат, ЦКР, ТПО, Ільнакамбінат і г. д. маюць балянсы толькі на 1 кастрычніка г.г. Такім чынам у банку няма галоўных матэрыялаў па якіх ён павінен весьці крэдытаваньне і выконваць пастанову СПА ад 23 ліпеня г. г. Да гэтага трэба дадаць, што вышэйпаказанымі прадпрыемствамі і арганізацыямі нічога ня робіцца, каб прывесьці ў парадак становішча справаздачнасьці, нават і ня гледзячы на тое, што РайКК РСІ прапанавала ім гэта зрабіць.

Яшчэ горш у справе камэрцыйнага крэдытаваньня. Тут да гэтага часу ўсё яшчэ мае месца ўзаемнае крэдытаваньне ўстановы ўстановай і г. д.

Вось пры такіх умовах банку прыходзіцца ўкараняць на Аршаншчыне новыя мэтады фінансавай работы.

Гэтыя перашкоды павінны быць рашучым парадкам зьнішчаны і пераход на мэтады мэтавага крэдытаваньня на Аршаншчыне павінен быць праведзены ўдарнымі тэмпамі.

А. Сёмкін.

### Правяраем гатоўкасьць заводу

#### да пераходу на новую крэдытную рэформу

Брыгада ўдарнікаў зрабіла наезд на кантору заводу «Бальшавік» з мэтай выявіць як бухгальтэрыя падрыхтавана да таго, каб з першага лістапада правесьці ў жыцьцё пастанову СНК і ЦК аб крэдытаваньні прамысловасьці.

Галоўбух вымушан быў прызнаць, што яны яшчэ нічога ня ўжылі для таго, каб па сапраўднаму падрыхтавацца да ажыцьцяўленьня дырэктыў партыі і ўлады, каб на 1-га лістапада сустрэць узброенымі ведамі правядзеньне ў жыцьцё навейшых партдырэктыў.

Аказваецца, што Белскураб'яднаньне яшчэ не разьмеркавала абаротных сродкаў атрыманых ад НКФ паміж сваімі прадпрыемствамі. «Бальшавік» яшчэ ня ведае колькі ён атрымае абаротных сродкаў гэта затрудняе пастаноўку далейшай работы.

Белскураб'яднаньню неабходна пасьпяшацца з разьмеркаваньнем рэсурсаў паміж прадпрыемствамі з тым, каб даць ім магчымасьць працаваць.

Бухгальтэрыя канторы «Бальшавіка» гатова даць балянсавыя весткі і матэрыяльныя рэшткі, але гэтага яшчэ мала. Неабходна правесьці інструктаваньне ўсяго апарату канторы з тым, каб забясьпечыць нармальны ход работы

З боку Белканторы і Менскага аддзяленьня Дзяржбанку адчуваецца непадрыхтаванасьць, няма ніякіх бланкаў ці картачак. Гэта бязумоўна здаб'ецца на правядзеньні ў жыцьцё пастановы СНК і ЦК.

Ударнікі абвясьцілі барацьбу за ўмацаваньне мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў, на сваячасовы 19 дзённы вытворчы цыкль, на суровейшую эканомію выдатканьня матэрыялаў на зьніжэньне сабекошту з тым, каб павялічыць абаротныя сродкі заводу.

Ударнікі патрабавалі ад работнікаў канторы найлепшай падрыхтоўкі да правядзеньня ў жыцьцё пастановы СНК і ЦК. Ад Белскураб'яднаньня—больш пільнасьці і паваротлівасьці ў справе разьмеркаваньня абаротных сродкаў паміж сваімі прадпрыемствамі.

Паводле ініцыятывы ўдарнікаў гэтае пытаньне пераносіцца на абгаварэньне агульназаводзкай нарады гаспадарча-разьліковых брыгад заг. цэхаў, майстраў, інжынэрна-тэхнічных работнікаў і работнікаў канторы заводу і цэхаў.

Ударнікі Менскай абутковай фабрыкі павінны па бальшавіцку ўзяцца за ліквідацыю дапушчаных імі прарываў, адміністрацыя і грамадзкая арганізацыя фабрыкі павінны аддаць усе сілы на тое, каб даць «Бальшавіку» магчымасьць нармальна працаваць, а гэта значыць ліквідаваць завінавачанасьць заводу ў 200.000 руб. і выканаць доўг перад крэдытам

Шамэс Язэп.

### Бястурботнасьць і непадрыхтаванасьць

#### Толькі швэйнікі гатовы да новай крэдытнай рэформы

Бабруйск. (Наш кар.). Прадпрыемствы Бабруйску не падрыхтаваны яшчэ да пераходу на новую крэдытную рэформу, якая ўстанаўляецца з 1 лістапада згодна пастановы ЦК і СНК ад 23 кастрычніка. Камунальны трэст да гэтага часу не правёў ніякай падрыхтоўчай работы да пераходу на новую крэдытную рэформу на сваіх прадпрыемствах. Працаўнікі апарату нават ня ведаюць сутнасьці гэтай новай крэдытнай рэформы. На адным з буйнейшых прадпрыемстваў Прамтрэсту—Эльводзе прамгандальпляну няма, падрыхтоўкі да пераходу на новую крэдытную рэформу не вядзецца.

Прадпрыемствы Камунтрэсту апартуністычна недаацэньваюць важнасьці правядзеньня гэтай рэформы. Нарада, якая склікалася Камунбанкам па пытаньнях новай крэдытнай рэформы, сарвана.

Ня маюць да гэтага часу балянсаў за апошні час і камбінат і леспрамгас і ня прымаюць ніякіх мер да фарсаваньня работы па окладаньні гэтых балянсаў, ня гледзячы на тое, што без гэтых балянсаў ім пагражае не атрыманьне ад банку крэдыту.

Выключэньнем з гэтага агульнага становішча непадрыхтаванасьці і бястурботнасьці зьяўляецца швэйная фабрыка, якая ўжо шырока абгаварыла пытаньне пераходу на новую крэдытную рэформу, забясьпечылася патрэбнымі матэрыяламі, правяла належную работу з рахунковым апаратам. Але прыклад швэйнай фабрыкі—адзіночны прыклад. Астатнія прадпрыемствы і гаспадаркі арганізацыі пакуль што бязьдзейнічаюць.

Па гэтай бязьдзейнасьці трэба бязьлітасна ўдарыць, чым папярэдзіць ажыцьцяўленьне пастаноў ЦК і СНК аб новай крэдытнай рэформе, аб укараненьні гаспадарчага разьліку і кантролю рублём.

А. Дамброўскі.

### Прэгрэсыўная сыстэма аплаты дае добрыя вынікі

У асноўным на заводзе «Бальшавік» абязьлічка і ўраўнілаўка ліквідаваны.

Па жэлятынным цэху дзяве брыгады варшчыкаў і выпаршчыкаў дзякуючы прагрэсыўнай сыстэме прэм'яваньня павялічылі сваю вытворчасьць працы за 10 дзён кастрычніка на 109 проц. Па хромавым цэху, пераведзеным на прагрэсыўку, разьбіўшчыкі таксама далі рад станоўчых вынікаў.

Прагрэсыўна-прэм'яльная сыстэма па здымцы сала па другому хромаваму цэху з 1 кастрычніка па 15 дала наступныя вынікі:

т. Шчуцько замест плянавага заданьня 750 кгр зьняў на 95 больш, т Бурым—на 60 кгр., т. Хасіневіч на 107 кгр. больш.

Брыгада выпаршчыкаў і паршчыкаў павялічыла сваю продукцыйнасьць працы ў сувязі з пераводам яе на прагрэсыўна-прэм'яльную сыстэму за верасень на 8,1 проц., за 10 дзён кастрычніка на 22,4 проц.

Гэтыя лічбы паказваюць, які штурмшок і зрух у рабоце брыгад, пераведзеных на прагрэсыўна-прэміяльную сыстэму. Па заводзе прыступілі таксама да нарманьваньня рахункова-гаспадарчага пэрсаналу. Да бухгальтароў і картатэчыкаў складзены праект пераводу на прэм'яльную сыстэму. З 1 лістапада машыністкі пераведзены на зьдзельную аплату.

У другім хромавым цэху шпальтоўка сьвяіней і вырасткаў пераведзена на зьдзельную аплату. Намечана таксама прыступіць да нарманьваньня асноўнага цэху і харчаваньня сталоўкі.

Акрамя гэтага намячаецца вылучэньне інструкцыйных картак па кожнай апэрацыі, у якіх апісаны кожны працэс работы і час затрачаны на даны прыём.

Правільнае правядзеньне прагрэсыўнай аплаты дае магчымасьць канцэнтраваць усе сілы на барацьбу за выкананьне і перавыкананьне плянавых заданьняў.

З. М—н.

### АПАВЯШЧЭНЬНІ

Парт. Тройка Гар. КК КП(б)Б выклікае на 5-е лістапада г. г. у 6 гадзін увеч. (Энгельса 28), наступных т.т. Яечко К. (з-д Бальшавік), Казлоў (ф-ка Акцябр), Дзядзюшка І. І. (Саюзкур), Ігнатовіч (Абутк. майстэрня), Сокалаў (з-д Камунар), Сушкевіч (Белсьпірт), Фікс (Белільнасаюз), Вараб'ёў (Парт. кал-у міліцыі), Яўфімаў (НКФ), Грашчанкаў (5 узв. аховы МВД), Дарашэвіч (Хімфармзавод), Місьліўчык (Вадаканалтрэст), Леановіч (Хімфармзавод), Якавенка (Лямцавая ф-ка), Буракоў А. Ф. (саўгас Лекерта), Берын (Камвуз), Калей (12-й разьмеркавальнік), Мухавошчык (з-д Варашылава), Нісенбаум (Дрож. завод), Новікаў (Курсы райпартактыву), Івашкевіч (ф-ка Утыль), Кужэль У., Левін (Транспартрэст), Копць (Гаржылсаюз), для ўдзелу ў разглядзе іх спраў. Таксама выклікаюцца сакратары ячэек, дзе гэтыя т.т. знаходзяцца на вучоце, Яўка абавязкова.

* * *

Аддзел Кадраў ЦК КП(б)Б просіць зьявіцца ў ЦК пакой № 33 тав. Розіна С. П. былога выкладчыка Смалянскага Тэхнікуму па асабістай справе. Асобы, якім вядома месца працы і жыхарства т. Розіна, просьба паведаміць Аддзел Кадраў ЦК.

Адказны рэдактар П. ШАСТАКОЎ.


«ДОМ» Пачатак а 7-8-45; 10-30 касы а 5 г.

Лепшы гукавы фільм АДНА

«100-ГОДЗІ» КУЛЬТУРА Пач. а 7, 8.45, 10-30. Каса а 5 г.

Замежны фільм Падарожжа Свэн-Гэдына па пустынях цэнтральнай Азіі. Звыш праграмы: УРАЧ ПАСЕДЖ СЭСІ АКАДЭМІІ НАВУК

КІНО «ПРАЦА» Адкрыта з 12 дня

Маставі фільм БАРЫСЛАЎ СЬПЯЦЕЦЦА (І Франко)

КІНО «ПЕТАРС» Адкрыта 12 дня

Маставі фільм Ла хач дзіцяці Звыш праграмы Наступленьне Ізраіля

ПОЛАЦКІМ ЦАГЕЛЬНЫМ ЗАВОДАМ ПАТРЭБЕН галоўны БУХГАЛЬТАР

АПЛАТА ПА ЗГОДЗЕ

Прадастаўляюцца камунальныя ўслугі

Жадаючых просім зьявіцца асабіста або накіраваць заяву.

Заводаўпраўленьне

ПРЫБЫЛУДЗІЛАСЯ КАЗА, белая з доўгаю поўсьцю, рагатая

Зварочваецца Мінск, Леўскі завулак, д. 6 к. 1.

Праз 10 дзён будзе лічыцца мёртвай.


## АБАВЯЗКОВАЯ ПАСТАНОВА № 37

Менскага Гарадзкога Савету Рабочых, Сялянскіх і Чырвонаармейскіх Дэпутатаў

3-га лістапада 1931 г. гор. Менск.

### АБ ПАРАДНУ СЬВЯТКАВАНЬНЯ XIV ГАДАВІНЫ КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ

Менскі Гарадзкі Савет Рабочых, Сялянскіх і Чырвонаармейскіх Дэпутатаў ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Абавязаць кіраўнікоў дзяржустаноў грамадзкіх, прафэсыянальных і каапэрацыйных арганізацый, а таксама ўласьнікаў дамаўладаньняў, належных дзяржустановам, грамадзкім арганізацыям і прыватным асобам, да 17-й гадзіны ўвечары 6-га лістапада, упрыгожыць займаныя імі памяшканьні і належныя дамаўладаньні сьцягамі, лёзунгамі, плякатамі і элюмінаваць іх.

2. Гандаль па гораду 3, 4, 5, 6, 7 і 8 лістапада вытварацъ, згодна пастановы Менскай Гарадзкой Інспэкцыі Снабжэньня „Аб гандлі ў сьвяточныя дні" апублікаванай у газэце „Зьвязда" ад 2 лістапада 1931 г.

3. Нагляд за выкананьнем гэтай абавязковай пастановы ўскладаецца на міліцыю.

4. Вінаватыя ў парушэньні гэтай абавязковай пастановы прыцягваюцца ў адміністрацыйным парадку—штрафу да 100 руб. альбо прымусовым працам да 15 дзён.

5. Гэтая абавязковая пастанова уваходзіць у моц з часу яе апублікаваньня.

Старшыня Гарсавету ВАЛОДЗЬКА

Сэкратар ШАЎКАВЕЦ

## УСІМ, ПАДАЎШЫМ ЗАЯВЫ

### на 9-цімесячныя курсы тэхнікаў-сьвінаводаў

пры Стара-Барысаўскім Сьвінагадоўчым Тэхнікуме

ДАВОДЗІЦЦА ДА ВЕДАМА, ШТО:

1. Прынята на курсы 105 чалавек, якім пасланы паведамленьні.

2. 292 заявы з дакумантамі перад дзены ў Віцебскі Ветэрынарны Інстытут дзеля залічэньня на курсы ветдактароў. Умовы тыя-ж, што і ў нас. Гэтым таксама рышом паведамленьні выслане Віцебскі Інстытут да 15 лістапада.

3. 263 заявы з дакумантамі не залічаных і не перададзеных у Віцебскі Інстытут зьвяртаюцца згодна адрасоў.

Дырэктар Тэхнікуму А. ЛЕНЬКОЎ.

З 1-га СТУДЗЕНЯ

## Магілеўскі Усебеларускі Дзяржаўны Палітыка-Асьветны Інстытут

### АБВЯШЧАЕ НАБОР

## на 3-хмесячныя падрыхтоўчыя курсы

ДЛЯ ВЯСНОВАГА НАБОРУ Ў ІНСТЫТУТ

На курсы камандыруюць РК КП(б), КСМ, райвыканкомы з кожнага раёну на менш 3-х асоб. Курсы камплектуюцца п рабфакамі, камсамольцамі, па 6 бальтычнае аддзяленьне маюць доступ беспартыйныя.

Адукацыя для паступаючых на курсы ня менш 7 мігодзі. Стаж практычнай работы партыйнай, камсамольскай, палітасьветпрацы не менш 2-х гоі.

Узрост паступаючых з 17 да 30 год Стыпэндыя на курсах—40 р. Студэнты забясьпечваюцца інтэрнатам.

Прыём заяў—(з дакумантамі: камандыроўка, даведка аб сацыяльным маемасным становішчы, узросту здароўі, адносны да вайсковай службы і заверанай анкеты)

адбываецца да 15-га сьнежня 1931 г.

Дырэктар Інстытуту КАПАЕВІЧ.

6 лістапада с.г. роўна а 7 гадзіне увеч. у памяшканьні кіно „Культура" АДБУДЗЕЦЦА

Урачыстае, прысьвячанае XIV гадавіне Кастрычніцкай рэвалюцыі,

паседжаньне пленуму Менскага Гарадзкога Савету

сумесна з ЦК КП(б), ЦКК КП(б), ЦК ЛКСМБ, ЦВК, СНК, ЦСПСБ, Гаркому КП(б), Гар. КК КП(б), Гар. КК КП(б), Гар. КСМБ, Гар рафсавету пры ўдзеле прадстаўнікоў Чырвонай арміі і працоўных прадпрыемстваў гораду Менску.

ПАРАДАК ДНЮ:

1. XV годзе рэвалюцыйнага будаўніцтва.
2. Мастацкая частка.

Уваходзіны ў памяшканьне: члены і кандыдаты гарсавету, члены ЦК КП(б), ЦКК КП(б), ЦК ЛКСМБ, ЦВК, ЦСПСБ, Гаркому КП(б), Гар. КК КП(б), Гар. КСМБ, і Гарпрафсавету—праходзяць па сваіх мандатах; вы бітнікі прадпрыемстваў і прадстаўнікі Чырвонай арміі—па запрашальных білетах, выдаваемых пры Гарпрафсавеце і нач. гарызону.

МЕНГАРСАВЕТ.

КОШТ [illegible] аб згубе 1 дакуманту 1 р.

Пры Гарінспэктарыяце Нарасьветы гор. Менску

## АДКРЫВАЮЦЦА 6-ЦІТЫДНЁВЫЯ КУРСЫ

### ПА ПАДРЫХТОЎЦЫ ДА ШКОЛЬНЫХ ПРАЦАЎНІКОЎ

Заявы прымаюцца ад работніц, жонак рабочых, саўгаснікоў і калгасьніц з адукацыяй ня ніжэй 5 груп сямігодкі.

Пры падачы заяў неабходна дакладаць дакуманты аб сацыяльным паходжаньні і адукацыі.

ПРЫЁМ ЗАЯЎ з 4-XI—15-XI 1931 г.

па адрасе: гор. Менск, Пляц Волі, Гарсавет—дашкольнаму інспэктару Нарасьветы (пакой № 15).

РЭДАКЦЫІ ГАЗЭТЫ „САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ"

## ПАТРЭБЕН СТЫЛЬРЭДАКТАР

ЗВАРОЧВАЦЦА ДА СЭКРАТАРА РЭДАКЦЫІ

## ВІЦЕБСКАМУ Камунальнаму Трэсту ПАТРАБУЕЦЦА ТЭХНІК-КАРМОЎШЧЫК

АПЛАТА ПА ЗГОДЗЕ

### ЗГУБЛЕНЫ:

Пасьведчаньне, выд. Асталопаўскім сельсаветам, на імя Шкрэдава А. М. К. кв. 1107 п.

Прафсаюзны білет Сяргеева Н. А. за № 1244 Кв. 1107 п.

Прафсаюзны білет Фаярцмана В. за № 234, выд. саюзам Наркомпошт. Кв. 1107 п.

Чырвонаармейская кніжка Сэўчанкі А. К. Кв. 1102 п.

Пенсійная кніжка Дазорцавай, выд. Горацкай страхкасай. Кв. 1107 п.

Вайсковы білет, выд. Горацкім РВК, Кажэмякіна, даведкі аб рабоце жірнічнага заводу, выд. Горацкім Белбудам. Кв. 1107 п.

Даведка Гарэлай А. В. аб нараджэньні Кв. 1107 п.

Дакумант Сіротка Алеся аб сацыяльным становішчы, выд. Назаселкаўскім сельсаветам і вайсковы білет выданы Пухавіцкім ваенкаматам. Кв. 1106 п.

Пасведчаньні Талкачова Н. С. за № 236, выд. Горацкай 7-х годкай. кв. 1197 п.

Кандыдацкі білет Мядзьведзева Т. К. за № 56365, выд. Горацкім райкомам. Кв. 1107 п.

Паявая кніжка Клязовіча Х. А. № 217 Сасноўскага рабкопу. К. кв. 1104 п.

Паявая кніжка Вінчанка Б за № 178. Кв. 1105 п.


Адрас рэдакцыі і выдавецтва: Менск, Пляц Волі, 17, першы паверх. Тэлефоны: адказнага рэдактара 7-69, сакратара—4-78, сэкгаразў—3-15. Выдавецтва—2-44. Выпускаючага 12-65 (два звязкі)

Падпісная плата: 1 месяц—1 руб. 3 м-цы—3 р., 6 м-цаў—6 р., 1 год—12 руб.

Упаўнаваж. Галоўлітбела № А—2521.

Друкарня імя тав. СТАЛІНА.